Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЧЭРВЕНЬ 8 1933 г. № 124 (4668)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Калектыўнаму прапагандысту, агітатару і арганізатару працоўнай моладзі--газ. „Чырв. зьм.“--бальшавіцкае прывітаньне!

Сіла камсамольскага друку ў тым, што ён кіруе камуністычнай партыяй на чале з любімым правадыром сусьветнага пралетарыяту т. **Сталіным.**

Сіла нашага друку ў тым, што ён тысячамі ніцей зьвязан з рабочай клясай і працоўнымі масамі. Наш друк ёсьць самая вострая, самая моцная зброя нашай партыі.

Дванаццацігадовы шлях «Чырвонай зьмены» і яе папярэднікаў — гэта шлях гераічнай пяцігодкі барацьбы пад кіраўніцтвам партыі Леніна за дыктатуру пралетарыяту, за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, за выхаваньне вялізарнай арміі працоўнай моладзі ў духу марксызму-ленінізму.

Дык няхай-жа і надалей магутны рупар ленінскага камсамолу Беларусі — «Чырвоная зьмена» — няхай мацней граміць ворагаў партыі і камсамолу, з бальшавіцкай энэргіяй арганізуе масы працоўнай моладзі на барацьбу за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Вышэй сьцяг марксызму-ленінізму!

Няхай жыве партыя Леніна на чале з тав. Сталіным — арганізатар і правадыр гераічных перамог пралетарыяту, кіраўнік і выхаваўца шматмільённай арміі ленінскага камсамолу!

Няхай мацнее і разьвіваецца моцная зброя ленінскага камсамолу Беларусі «Чырвоная зьмена»!

«ЗЬВЯЗДА».

У адказ на пастанову СНК і ЦК неадкладна завяршым сяўбу, разгорнем ворыва папараў і праполку, узорна падрыхтуемся да ўборкі

ВАЖНЕЙШЫ ДАКУМАНТ

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб мерапрыемствах па правядзеньні папаравай, праполачнай і ўборачнай кампаній—дакумант выключнага значэньня.

Сваёй пастановай СНК і ЦК даюць канкрэтную праграму работы для ўсіх партыйных і савецкіх органаў, для ўсіх с.-г. арганізацый.

Наша рэспубліка набліжаецца да поўнага завяршэньня сяўбы. У чым зараз асноўныя задачы?

ГАЛОЎНАЕ, РАШАЮЧАЕ цяпер у тым, каб неадкладна і поўнасьцю **ЗАВЯРШЫЦЬ СЯЎБУ** і пераключыць усе нашы сілы, усе сродкі на **ВОРЫВА ПАПАРАЎ, ПРАПОЛКУ І ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ.** Імен на ў гэтым цяпер — асноваасноў.

Нельга далей марудзіць ні аднэй мінуты з завяршэньнем веснавой сяўбы. Партыя не пацерпіць адтэрміновак! Сяўба яравых павінна быць скончана неадкладна і з поўным выкананьнем устаноўленага пляну на ўсіх сэктарох і культурах.

Жалезны бальшавіцкі адпор усялякім дэмабілізацыйным тэндэнцыям, спробам зацягнуць сяўбу, шкодным на строям «міжпапар'я»!

А настроі «міжпапар'я», імкненьні супакоіцца пасьля сяўбы яравых, так сказаць, адпачыць—даволі папыраныя. Прыслушы рапарт аб скончаньні веснавой сяўбы, людзі супакойваюцца, ад пачываюць, лічаць, што справа ўся зроблена...

Вазьмеце Бабруйскі раён. Калгасы скончылі сяўбу яравых больш 10 дзён назад. Цэлы рад калгасаў засеялі яравыя яшчэ раней. Як-жа праходзіць ворыва папараў, як арганізавана барацьба з пустазельлем? Аказваецца, да самых апошніх дзён ні адзін калгас у раёне не прыступаў да ворыва папараў. Аказваецца, ні адзін гэктар пасеваў, прыкладна, да 3-4 чэрвеня ня быў ачышчан ад пустазельля.

Яркай ілюстрацыяй зьяўляецца калгас імя Красіна. Калгас даўно адсеяўся, а да ворыва папараў і праполачных работ не прыступіў. Папар, азімыя і яравыя зарастаюць пустазельлем.

Бабруйск—не выключэньне. Шкодныя настроі «міжпапар'я», тэндэнцыі апартуністычнага самасупакою моцна праяўляюцца і ў іншых раёнах, як **Тураў, Жытковічы, Ельск** і г. д.

Мы ўступілі ў самы **РАШАЮЧЫ ЭТАП** нашай барацьбы за ўраджай. Уварваць і ўгнаіць папары, захаваць ад пустазельля кожны засеяны гэктар і добра, за самы найкарацейшы тэрмін правесьці ўборку, убраць ураджай бяз страт, арганізаваць пільную ахову ўраджаю—вось у чым корань цяпер усёй партыйна-масавай і арганізатарскай работы на вёсцы.

Сапраўды мабілізаваць масы на ўзорнае правядзеньне ўборачнай кампаніі, **НА ХУТКАЕ І ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ**—вось у чым самая галоўная, самая важнейшая задача ўсіх партыйных арганізацый!

Па ініцыятыве зьезду калгасьнікаў ударнікаў Татарыі арганізуецца **ЎСЕСАЮЗНАЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ, НА ХУТЧЭЙШУЮ І ПОЎНУЮ ПАСТАЎКУ ЗБОЖЖА І ІНШЫХ С.-Г. ПРАДУКТАЎ ДЗЯРЖАВЕ.**

Усе нашы раёны, усе нашы саўгасы, МТС, калгасы павінны неадкладна на справе ўключыцца ў гэта спаборніцтва, мабілізаваўшы свае сілы, сваю волю, сваю энэргію на практычнае выкананьне дырэктыў СНК і ЦК аб правядзеньні папаравай, праполачнай і ўборачнай кампаніі, аб свячасовай пастаўцы збожжа дзяржаве.

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б —бальшавіцкая пуцёўка на важнейшы этап с.-г. кампаніі першага году другой пяцігодкі.

Настроям «міжпапар'я», апартуністычнаму самасупакою—моцны і рашучы адпор!

Свячасова і добра ўзараныя папары—магутны вагар у барацьбе за высокі ўраджай азімых. Па нашай рэспубліцы павінны быць зараны 420.000 гэктараў.

Ворыва трэба скончыць максымум да 25 чэрвеня—ні на дзень пазьней і ні на адзін гэктар менш!

Справа ня толькі ў тым, каб узараць папары. Уварваць трэба добра—на адпаведную глыбіню, правёўшы ваннаваньне і тарфаваньне глебы.

АСАБЛІВАЯ ПІЛЬНАСЬЦЬ—да найменшых спроб працянуць шкодную, асуджаную партыяй і ўрадам «тэорыю» мелкага ворыва. Гэта «тэорыя» адлюстроўвае супраціўленьне клясава-варожых, буржуазна-кулацкіх элемэнтаў. Пры мелкім ворыве эфэктыўнасьць папаравай кампаніі зводзіцца фактычна да нуля. Карэньні пустазельля застаюцца ў зямлі, пагражаючы такім чынам ураджаю азімых.

Чыстыя папары павінны быць узараны на глыбіню ня менш 12-15 см. Этым задача яшчэ не вырашаецца. ЦК і ЦК рашуча падкрэсьлілі неабходнасьць культурнага і паўторнага ворыва папараў на поўную глыбіню — 15-18 см.

Вельмі важным мерапрыемствам зьяўляецца свячасовае ворыва занятых папараў. Яго нельга зацягваць нельга адкладваць на позьні час, калі ўжо трэба засяваць азімыя. Занятыя папары павінны быць зараны ні ў якім разе не пазьней як за 10-15 дзён да асеньняй сяўбы.

У тэрмін, глыбока ўзараць і ўгнаіць папары, правесьці ня менш 2-3 раз культывацыю і паўторнае ворыва на поўную глыбіню—вось у чым задача!

Урокі мінулых год красамоўна паказалі, якія вялікія страты прымосіць пустазельле. На барацьбу з пустазельлем, на праполачныя работы трэба кінуць неадкладна максымум сродкаў і сіл.

Масавая праполка азімых і каласовых яравых праводзіцца сёлета ўпершыню. Гэта ўскладае на райкомы і райвыканкомы, райзямаддзелы, МТС і праўленьні калгасаў асабліву адказнасьць за правільную расстаноўку сіл і арганізацыю праполачных работ.

Час пакончыць з настроямі, што поліва гэта выключна «бабская справа». За ахову азімых і яравых ад пустазельля, за праполку іх яшчэ да выхаду ў трубку адказвае пастаянная вытворчая брыгада.

СНК і ЦК далі вусім ясныя ўказаньні на арганізацыі праполкі ільну, проса, кораньплодаў і гародніх культур, на баранаваньні і абсыпцы бульбы. Поўнасьцю і прытым неадкладна выканаць указаньні СНК і ЦК—вось баявы лёзунг для ўсіх партыйных і зямельных арганізацый, для ўсіх палітаддзелаў, баявое выпрабаваньне кожнага камуніста.

Не пакінем ні аднаго каліва пустазельля на засеяных палёх!

Сур'ёзнейшая ўвага аддана ў пастанове СНК БССР і ЦК КП(б)Б пытаньням **СЕНАЎБОРАЧНАЙ** кампаніі і **СІЛАСАВАНЬНЯ.** Пастаўлены выключна важныя задачы, якія маюць жыцьцёвае значэньне для справы далейшага ўздыму жывёлагадоўлі.

Адных толькі прыродных сенажацяй трэба ўбраць на плошчы 1.822.110 гэктараў. Плян сіласаваньня ўстаноўлен у 537.450 тон.

Што новае ўносіць пастанова СНК і ЦК?

Плян сенакашэньня і сіласаваньня павінен быць даведзен да кожнага калгасу і саўтасу ня толькі ў гэктарах, **АЛЕ І Ў КОЛЬКАСЬЦІ СЕНА І СІЛАСАВАНЫХ КАРМОЎ.** Практыка мэханічнага давядзеньня пляну толькі ў гэктарах павінна быць **РАШУЧА ЗЖЫТА.** Цяпер кожны саўгас і калгас абавязаны так арганізаваць сенаўборку, забясьпечыць такую якасьць работ, каб сабрать максымальную колькасьць сена, ні ў якім разе ня ніжэй устаноўленай паводле даведзеных пляновых заданьняў.

Важнейшая задача сенаўборкі гэтага году—ня толькі стварыць поўныя запасы сена і кармоў для аграмаднжаных і неаграмаднжаных жывёлы. Павінен быць створан таксама (і гэта асабліва важна) **НЕДАТЫКАЛЬНЫ ЗАПАС КАРМОЎ НА БУДУЧУЮ ВЯСНУ.**

Сенаўборка не за гарамі. У паўднёвай зоне яна павінна разгарнуцца мак сымум праз тыдзень. Лічаныя дні, якія засталіся да пачатку сенаўборкі, трэба скарыстаць на тое, каб неадкладна замацаваць за пастаяннымі вытворчымі брыгадамі вучасткі сенажацяй, дзе гэтага яшчэ няма, загадзя правяць расстаноўку сіл, давесьці дакладныя вытворчыя заданьні і нормы выпрацоўкі, адрамантаваць увесь уборачны інвэнтар і г. д.

Уборка ўраджаю—баявы і рашаючы экзамэн. Якасьць работы па ўмацаваньні калгасаў будзе правяраца іменна на выніках уборачнай кампаніі, на выкананьні абавязацельстваў перад пралетарскай дзяржавай.

СНК і ЦК даны вычарпальныя дырэктывы, вычарпальныя ўказаньні па падрыхтоўцы да ўборкі, па арганізацыі ўборачных работ. Задача цяпер заключаецца ў тым, каб, фарсуючы ўздым ворыва папараў і праполку зараз-жа, ня трацячы ні аднаго дня, на справе рыхтавацца да ўборачнай кампаніі, да свячасовага і добрага правядзеньня пастаўкі збожжа і іншых с.-г. прадуктаў дзяржаве.

Фронт уборачнай—фронт абвостранай клясавай барацьбы. Клясавая пільнасьць кожнага камуніста, кожнага калгасьніка і працоўнага аднаасобніка павінна быць асабліва ўзьнята. У корані зьнішчым найменшыя спробы кулацка-шкодніцкіх элемэнтаў—арганізаваць раскрадваньне новага ўраджаю. Да ворагаў народу, да раскрадальнікаў сьвяшчэннай грамадзкай уласнасьці—шчыкай літасьці!

Бальшавіцкай мабілізацыяй усіх сіл на правядзеньне папаравай, праполачнай і ўборачнай кампаніі, **НА ПАСТАЎКУ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ**—дабіцца рашаючай перамогі ў нашай барацьбе за ўраджайнасьць, за бальшавіцкія калгасы, за ператварэньне ўсіх калгасьнікаў у заможных.

ГАЗЭТА З ПРЫТУПЛЕНАЙ ПІЛЬНАСЬЦЮ

„КАМУНАР МАГІЛЕЎШЧЫНЫ“

Кам ў большасьці раёнаў БССР ужо разгортваліся масавыя палявыя работы, у Магілеўшчыне разважалі: **«СЬПЯШАЦЦА НЯ ВАРТА, ПАЧАКАЕМ ЛЕП ШАГА НАДВОР'Я».**

Раённая газэта «Камунар Магілеўшчыны», заявіла, скромна кажучы, нэйтральную пазыцыю. На працяку першай паловы красавіка газэта ні разу не паставіла сур'ёзна пытаньне аб барацьбе супроць сабатажнікаў раньняй сяўбы, ня выкрыла супрасьці шырока распаўсюджаных у Магілеўскай арганізацыі апартуністычных спасыланьняў на «дроннае» надвор'е і іншыя «аб'ектыўныя» прычыны. Замест гэтага рэдакцыя сама ў паўнай ступені стала рупарам па супрасьці кулацкіх тэндэнцый, накіраваных супроць раньняй сяўбы. У нумары за 3 красавіка «К. М.» голасна заявіў:

«ЗАРАЗ ЯШЧЭ НА ПОЛІ ПРАЦАВАЦЬ НЕЛЬГА...»

А калі, наперакор гэтай устаноўцы «К. М.», перадавыя калгасы раёну — **«КАМІНТЭРН»,** Слабодзкага сельсавету, **«ЧЫРВОНЫ ПРАЦАЎНІК»,** Дашкаўскага сельсавету і інш. 6 красавіка дружна вышлі ў поле і ўзяліся за ворыва і сяўбу, газэта выступае з палаской пад апшлягам:

«ПРАЗ ДЗЕНЬ-ДВА ВЫХОДЗІМ У ПОЛЕ».

Калгасы праводзяць ворыва, баранаваньне і сяўбу, а рэдакцыя «Камунара Магілеўшчыны» чамусьці ня верыцца. Паводле яе думкі, можна так сабе гэта, ня сьпяшаючыся і дзянькі два спусьціўшы, пачаць работу ў полі. Факт гаворыць сам за сябе. Тут вусім відавочнае ігнараваньне з боку «К. М.» задачы мабілізацыі мас на барацьбу за раньнюю сяўбу, якая абумоўлівае ўздым ураджайнасьці.

Пасьля тэлеграмы ЦК і СНК аб разгортваньні масавай сяўбы аўса і раньніх яравых «Камунар Магілеўшчыны» 16 красавіка прысьвячае гэтаму пытаньню перадавы артыкул. У артыкуле га ворыцца аб чым толькі хочаце, але **ЗАБЫВАЕЦЦА АСНОЎНАЕ — УШЧЫЛЬНЕНЬНЕ ТЭРМІНАЎ СЯЎБЫ.** Адсюль і вынікі. Роўна праз дэкаду пасьля вымешчанага перадавога артыкулу аб разгортваньні сяўбы «Камунар Магілеўшчыны» канстатуе:

«ГУСЬЛІЦЧАНСКІ сельсавет — не распачата ворыва.

ШЧЭЖАРСКІ сельсавет — ворыва і баранаваньне не распачата.

ВЕНДАРАСКІ сельсавет — нічога не засеяна.

ВІШАЎСКІ сельсавет — да баранаваньня і сяўбы не прыступілі.

ГРАБЯНЕЎСКІ сельсавет — не засеяна ні аднаго гэктара.

КНЯЖЫЦКІ сельсавет — да сяўбы не прыступілі».

Прычыны? Яны ясны. Самацёк у рабоце раённых кіруючых арганізацый, адсутнасьць баявой мабілізацыі мас з боку «К. М.» на пасьпяховае правядзеньне сяўбы, адсутнасьць належнай барацьбы супроць кулацкага сабатажу і апартуністычнай практыкі прывялі да зрыву тэрмінаў сяўбы аўса і раньніх яравых.

Толькі ў самым канцы мая на старонках «Камунара Магілеўшчыны» пачалі праблісківаць заклікі «бязьлітасна біць па апартуністычных спасыланьнях на надвор'е». А да гэтага часу газэта сталла ў бачку і маўчала нібы вады ў рот набраўшы.

Уся бяда рэдакцыі «К. М.» у тым, што яна ў абсалютнай большасьці выпадкаў запаўняла палосы самацёчным матар'ялам, які нікога нічаму не навучаў. Газэта ні разу не паставіла больш менш грунтоўна пытаньне аб недахопах работы раённай партгарганізацыі па правядзеньні сяўбы, не накіравала вострасьці бальшавіцкай крытыкі супроць апартуністычнай практыкі, ня выкрыла саноўна-панскіх мэтадаў кіраўніцтва ў практыцы раённых работнікаў.

Вопыт перадавых калгасаў раёну, якія пасьпяхова скончылі сяўбу, не знайшоў месца для асьвятленьня ў «Камунары Магілеўшчыны». Рэдакцыя абмяжоўвалася толькі зьмяшчэньнем рапартоў, прычым з абавязковай самарэклямай ранёнага начальства і самога рэдактара.

Калгас **«ВІДНЫ ШЛЯХ»** 9 мая першым у раёне скончыў сяўбу. У сувязі з гэтым рэдакцыя зьмясьціла 16 мая допіс «Парадачкам бяз мітусьні». У гэтым допісе толькі ўсяго і паказана агульнымі фразамі, як выходзяць калгасьнікі на поле.

Ігнаруючы важнейшыя пытаньні барацьбы за пасьпяховае выкананьне пляну сяўбы, рэдакцыя «К. М.» часамі, не пакідаючы ні месца, ні часу, нават у «мастацкіх» фарбах славядае, як, напрыклад, работнікі Чырвонапольскага сельсавету і калгасу «Камінтэрн» п'янствуюць. З выключнай асьвядомленасьцю ва ўсіх дэталях вышітай гарэлкі, кошту напітых музык, сколаў, зьместу гамонкі п'яных людзей, брыгада «К. М.» у складзе **ЮРГІСА** і **ЛІСУНА** на чатырох калёнках падвальнага артыкулу разводзіць нікчэмную галімацыю, аб чым можна было сказаць у 5-10 радках. А вось такое становішча, як сыстэматычнае зьлізваньне тэмпаў сяўбы ў раёне, «Камунар Магілеўшчыны» ня здолеў па-сапраўднаму прааналізаваць і палітычна ацаніць.

Характэрна, што нават пасьля наведваньня Магілеву тав. **ГІКАЛО,** які ў сваім выступленьні 16 мая на сходзе гарадзкога партактыву, характарызуючы работу Магілеўскай партгарганізацыі, падкрэсьліў, што **«МАГІЛЕЎСКІ РАЁН БОЛЬШ, ЧЫМ КАНДЫДАТ НА ЧОРНУЮ ДОШКУ»,** «К. М.» не зьмяніў свайго тону, а па-ранейшаму заставаўся роўнадушным фіксатарам ганебных прарываў у сяўбе.

Больш таго, рэдакцыя «К. М.» паставіла мэтай умаліць вострасьць ацэнкі стану сяўбы ў Магілеўскім раёне, даную ў выступленьні тав. Гікало. У перадавым артыкуле за 24 мая газэта кажа сталае:

«Агульны раённы плян выкананы усяго на 65 проц. Такім чынам, наш Магілеўскі раён недалёк ад таго, каб быць кандыдатам на чорную дошку».

Якая асьцярожная і вёртуозная фармулёўка! **НЕДАЛЁК АД ТАГО, КАБ БЫЦЬ КАНДЫДАТАМ НА ЧОРНУЮ ДОШКУ».** Параўнайце, тав. рэдактар, сваю фармулёўку са словамі: **«Магілеўскі раён БОЛЬШ, чым кандыдат на чорную дошку».** І пераканайцеся ў тым, як вы дэзарыентуеце масы.

Простай выпадковасьцю такую лінію, якую запяло кіраўніцтва рэдакцыі «К. М.» у **РАШАЮЧЫЯ** дні завяршэньня сяўбы, тлумачыць нельга. Зусім відавочна, што **КІРАЎНІЦТВА РЭДАКЦЫІ «К. М.» САМО АПЫНУЛАСЯ Ў ПАЛОНЕ АПАРТУНІСТЫЧНЫХ СПАСЫЛАНЬНЯЎ НА «АБ'ЕКТЫЎНЫЯ» ПРЫЧЫНЫ.**

Тэлеграма т. т. **ГІКАЛО І ГАЛАДЗЕДА** ад 2 чэрвеня зьяўляецца апошнім суровым папярэджаньнем ня толькі раённым кіруючым арганізацыям Магілеўшчыны, а і кіраўніцтву рэдакцыі «К. М.». ЦК і СНК патрабуюць балвой перабудовы работы ўсіх арганізацый Магілеўшчыны. Раён яшчэ і на сёньняшні дзень не дабіўся поўнага завяршэньня сяўбы. Не малую віну за гэта нясе «Камунар Магілеўшчыны».

НА 5 ЧЭРВЕНЯ ЗАСЕЯНА ПА БССР 2.320.907 га

НА 5-ГА ЧЭРВЕНЯ ПА БССР ЗАСЕЯНА 2.320.907 ГЭКТАРАЎ. ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 91,9 ПРОЦ.

ЗБОЖЖАВЫХ ЗАСЕЯНА 99,1 ПРОЦ., ІЛЬНУ 93,1 ПРОЦ., БУЛЬБЫ — 93,8 ПРОЦ., АЎСА — 92,8 ПРОЦ. І КАНАПЕЛЬ — 74,1 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

ПА ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЗОНЕ ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ ВЫКАНАН НА 93,6 ПРОЦ., ПА ПАЎНОЧНАЙ ЗОНЕ — 72,8 ПРОЦ. І ПАЎДНЁВАЙ — 100,3 ПРОЦ.

ЦК КП(б)Б — ТАВ. ГІКАЛО, СНК БССР — ТАВ. ГАЛАДЗЕДУ, ЦВК— ТАВ. ЧАРВЯКОВУ, НКЗБ—ТАВ. БЭНЭКУ, РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА»

5 ЧЭРВЕНЯ ПЛЯН СЯЎБЫ ПА ПОЛАЦКІМ РАЁНЕ Ў 48.272 ГА ВЫКАНАН 48.312 ГА, АЛЬБО 100,1 ПРОЦ. У ТЫМ ЛІКУ ІЛЬНУ ЗАСЕЯНА 6.497 ГА — 103,1 ПРОЦ. СЯЎБУ ПРАЦЯГВАЕМ.

САКРАТАР РК КП(б)Б **ЕЎСЕЕНКА.**
СТАРШЫНЯ РВК **ШАБАЛТАС.**
ЗАГАДЧЫК РАЙЗА **ШЭРЫКАЎ.**

У палоне кулацкіх настрояў

ТАЛАЧЫН, 4.

У часе загатовак Талачынскі раён увесь час рэзка адставаў і быў занесен на чорную дошку. Раённае кіраўніцтва аказалася нездольным выканаць важнейшую дырэктыву партыі і ўраду і мабілізаваць актыўнасьць калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на свячасовае завяршэньне загатовак, зламаць кулацкі сабатаж.

Зараз у часе веснавой сяўбы Талачын зноў на чорнай дошцы. Гісторыя паўтараецца.

На 1-га чэрвеня плян сяўбы быў выкананы на 66 проц., пры чым аднаасобнікі засеялі толькі 51,6 проц. яравога кліну.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваім апошнім папярэджаньні адстаючым раёнам падкрэсьлілі, што першая пяцідзёўка чэрвеня зьяўляецца для іх апошнім тэрмінам сяўбы. Гэта папярэджаньне ў першую чаргу датычыла Талачынскага раёну.

Якія-ж вывады зрабілі талачынскія арганізацыі?

Лепш за ўсё аб гэтым сьведчаць лічбы. На 5 чэрвеня Талачын даў толькі 51,2 проц. пасеўнага пляну.

Райком КП(б)Б і райвыканком проста ігнаравалі дырэктыву ЦК і СНК, на тэлеграму ж адгукнуліся ні адным словам, як быццам гэта іх не датычыць.

У раённым цэнтры і ў сельсаветах пануе поўны спакой.

Рад адказных раённых работнікаў проста апынуліся ў палоне кулацкіх тэндэнцый і выступаюць з кулацкімі тэорыйкамі аб «нематчымасьці» выканаць плян.

Так, напрыклад, загадчык зямаддзела РК КП(б)Б **СЯМЁНАЎ** і старшыня РКК **ДЗІНЭРШТЭЙН** заяўляюць:

— Больш 80 проц. пляну ня выканаем, няма насеньня.

Ім утаруе і сакратар Лёзьнянскай партыйнай ячэйкі Рылькоў, які таксама заяўляе:

— Насеньня няма, плян ня выканаем.

А на справе?

У вёсцы Зыбава кулакі Берставы, распрадаўшы ўсё сваё насеньне, адкры та выступаюць за зрыў сяўбы і падбухторваюць аднаасобнікаў ня сеяць.

У калгасе «Ленінскі шлях» насеньне проста разбазарыў. У вёсцы Латыгоўка член сельсавету Мядзьведзеў разам з кулакамі раскрад насенныя фонды, а ў сельсавет піша, што насеньня не хапае.

Аднаасобнікі—найбольш адсталы вучастак у раёне. Яны засеялі ўсяго 51,6 проц. яравога кліну. Між тым масава-арганізацыйная работа сярод аднаасобнікаў у загоне. Райком партыі за ўвесь час сяўбы не заслухаў дакладу ні адной партыйнай ячэйкі аб ходзе сяўбы ў аднаасобным сэктары.

Загадчык аргаддзелу РК Сямёнаў зьяўляецца ўпаўнаважаным па 2-х сельсаветах—Скуратаўскім і Маржнеўскім. Уся яго работа зводзіцца да таго, што ён выедзе ў сельсавет на вялёсыпэдзе, пагутарыць з членамі сельсавету і ўсё. Што робіцца ў калгасе, у брыгадзе, на полі, у дзесяцідворцы—Сямёнава ніколькі ня цікавіць.

На сходах Сямёнаў выступаў з агульнымі дэклярацыямі, алілюйскімі заявамі, але вельмі мала гаварыў канкрэтнага, што датычыла дадзена калгасу, даная вёскі. Ён заўсёды пачынаў з міжнародных маштабаў, з міжнароднага становішча, а пакуль падыходзіў да канкрэтнага, на сходзе ўжо нікога не заставалася.

Райком КП(б)Б толькі і рабіў, што прымаў бясконцыя пастановы і рэзалюцыі, у якіх «адзначаў», «прызнаваў», «прапаноўваў».

Работа ўпаўнаважаных РК і РВК, пасланых у сельсаветы, нікім не правяралася. У якасьці ўпаўнаважаных пасылалі каго папала.

Упаўнаважаным па Алёнаўскім сельсавеце быў выдучан Сяргейчык—сын кулака. Ён адкрыта выступіў за зрыў сяўбы, кажучы:

— Плян можна ня выканаць.

Разам з кулакамі Няхаевымі і Шыманскімі Сяргейчык арганізаваў сабатаж сэмкі насеньня.

Другі ўпаўнаважаны Сукала—быды загадчык райзямаддзелу, трымаў цесную сувязь з шкодзікамі з Наркамзему і з кулакамі Ваўчкамі. На сыгналы раённай газэты аб дзейнасьці Сукала РК КП(б)Б зусім не рэагаваў. Толькі, калі цэнтральныя газэты выкрылі ўчынкі Сукалы, РК КП(б)Б зьняў яго з пасады загадчыка райза і накіраваў загадчыкам Круглянскага вытворчага вучастку МТС.

Там Сукала далей вядзе сваю падрыўную дзейнасьць. У калгасе «Хваля» разам з кулакамі Гусьцінкавымі ён арганізуе раскрадваньне насеньня і зьнішчэньне калгаснага стада. РК КП(б)Б і РСІ ведаюць аб гэтым, але чамусьці маўчаць.

Паўлаўскі сельсавет выканаў плян сяўбы толькі на 50 проц. Сакратаром у сельсавеце працуе кулак Запанянскі, які разам з кулакамі Галаўковымі арганізаваў сабатаж сяўбы ў вёсцы Шаткавіня. Сакратар партыйнай ячэйкі Аўсеенка і старшыня сельсавету Шабароўскі патураюць гэтаму кулацкаму сабатажу.

РК КП(б)Б замест рашучай барацьбы з сабатажнікамі, абмежаваўся некалькімі вымовамі і папярэджаньнямі.

Прыведзеныя факты з усёй ясьнасьцю выкрываюць сапраўдныя прычыны таго, чаму Талачыншчына апынулася на чорнай дошцы, чаму ня выканана дырэктыва ЦК і СНК.

Ч.

ГОМЕЛЬШЧЫНА КОНЧЫЛА СЯЎБУ ЯРАВЫХ

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО, СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ, НКЗ БССР--тав. БЭНЭКУ, „ЗЬВЯЗДЗЕ“

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў Гомельшчына поўнасьцю выканала плян сяўбы яравых.

Засеяна 25.043 га, заданьне—25.000 га. У гэтым годзе сяўба скончана на 28 дзён раней чым у мінулым. Прычым, у 1932 годзе было засеяна 23.138 га.

Сяўба працягваецца. Раён пераключыўся на ворыва папару і поліва і ўзяў на буксір Веткаўскі, Церахоўскі і Віцебскі раёны.

Сакратар гаркому КП(б)Б ШАФАРЭНКА
Старшыня гарсавету РАЧЫЦКІ
Загадчык гарземаддзелу ГРАБУЗАЎ

Прыезд тав. Мікаяна ў Менск

НА ЗДЫМКУ: НКС СССР Тав. МІКАЯН разам з сакратаром ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО і стар. СНК тав. ГАЛАДЗЕДАМ НА Менскім хлебазаводзе правяраюць якасьць хлеба.

6 чэрвеня ў Менск прыехаў з Масквы народны камісар снабжэньня Саюзу тав. МІКАЯН.

Мэта прыезду—азнаямленьне з пастаноўкай снабжэньня і гандлю хлебам.

На вакзале наркома сустракалі: члены бюро ЦК КП(б)Б, члены ўраду, калегія і адказныя работнікі Наркамснабу БССР.

Днём тав. МІКАЯН разам з сакратаром ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО, старшынёю СНК тав. ГАЛАДЗЕДАМ, старшынёю праўленьня Саюзпрамхлебапячэньня тав. ЗАВОДНІКАМ, работнікамі Наркамснабу наведаў нова-пабудаваную мэханізаваную хлебапякарню, а таксама хлебазавод, яго лябараторыю і саматужную пякарню.

На хлебазаводзе тав. МІКАЯН, дэтальна азнаёміўшыся з вытворчасьцю, зьвярнуў увагу на прагарэласьць скарынкі хлеба, павышаны брак, неўпарадкаванасьць транспартаваньня хлеба і ў прыватнасьці адсутнасьць скрынак для перавозкі хлеба.

У гутарцы з супрацоўнікам «Зьвязды» нарком указаў, што менскі хлеб увесь час быў вядомы, як адзін з лепшых у Саюзе. Цяпер па якасьці апярэдзілі Масква, Ленінград, Харкаў. Менск павінен аднавіць сваю ранейшую рэпутацыю і даць рабочаму спажыўцу хлеб высокай якасьці. Задача партыйнай арганізацыі, рабочай грамадзкасьці хлебазаводу—мабілізаваць усю рабочую масу, ударнікаў на барацьбу за паляпшэньне і ўзьняцьце якасьці.

У Старажоўскім аддзяленьні хлебазаводу тав. МІКАЯН азнаёміўся таксама з дапаможнымі гаспадаркамі—сьвінарнікам, трусатнікам і г. д.

Увечары тав. МІКАЯН наведаў гістарычны дом, дзе адбываўся першы зьезд РСДРП.

ПЫРНІК І АСОТ ПАЛОНЯЦЬ ГАРОДЫ

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

Калгас «Чырвоная Бярэзіна» мае гародні ўхіл. Са 140 га яравых 54 га займаюць гародніх культуры.

Калгас у асноўным скончыў сяўбу. Плян за выключэньнем часткі бульбы выканан.

Каб атрымаць высокі ўраджай, неабходна зараз усю ўвагу сканцэнтраваць на доглядзе пасеваў. Сюды ў першую чаргу адносіцца поліва ўсходаў, баранаваньне бульбы, абсыпка.

Для калгасу «Чырвоная Бярэзіна», які мае шмат гародаў, поліва мае рашаючае значэньне.

Але кіраўніцтва калгасу, відавочна, думае, што выканаўшы плян сяўбы, яно ўжо ўсё зрабіла. Догляд пасеваў, поліва прадастаўлена самацёку. Калі ў часе сяўбы ў гародняй брыгадзе працавала 60 чалавек, дык зараз на поле выходзіць ня больш 30-35. Калгасьнікі сьвяткуюць «сёмуху», езьдзяць на кірмаш і вусім закінулі палявыя работы.

А тым часам пустазельле — асот, лебеда, пырнік — палоняць гароды. Вось градкі сталовых буракоў. Кволыя, чырвоныя лісточкі буракоў трацяць апошнія сілы ў няроўным змагачыні з лебядой, якая вельмі разраслася. Або вось сталовы гарох. Яго ўжо ня відаць, яго канчаткова заглушыла пустазельле.

— Мабыць, трэба будзе прапалоць, — няўпэўнена кажа старшыня калгасу Рубінштэйн.

Ён яшчэ не пераканаўся ў неабходнасьці палоць гарох.

Пару слоў аб якасьці поліва. Палольшчыцы ў пагоні за колькасьцю зусім не зварачаюць увагі на якасьць, каб добра выпалаць усё пустазельле. На другі дзень пасьля поліва грады пакрыліся пчаціным пырнікам. Гэта таму, што палольшчыцы ня вырывалі пустазельля з карэньнем, а толькі сарвалі верх травы. Ад такога поліва пырнік яшчэ больш разрастаецца.

Калгас «Чырвоная Бярэзіна» — ня выключэньне. Раённыя арганізацыі пасьля скачэньня сяўбы таксама дэмабілізаваліся. Райзямаддзел дагэтуль не паладзіў апэрацыйнага ўліку ходу поліва, а бяз гэтага ня можа быць і апэрацыйнага кіраўніцтва.

П. Ч.

Забойства Афганскага пасланьніка ў Бэрліне

БЭРЛІН, 6. (ТАСС). Сёньня ў Бэрліне ў будынку афганскага пасольства афганец КЕМАЛЬ СІЗД, які вучыцца ў Бэрліне, зрабіў 5 выстрэлаў з рэвальвэру ў афганскага пасланьніка ў Бэрліне (быв. афганскага паспа ў Маскве) МУХАМЭД-АЗІС-ХАНА. Пасланьнік быў цяжка паранен і хутка пасьля дастаўкі ў больніцу, ня прыходзячы ў прытомнасьць, памёр. Адным з выстрэлаў быў паранен у галаву студэнт МУХАМЭД АТІК, сваяк пасланьніка, які знаходзіўся ў яго ў гасьцях. Паводле вестак газэт, прычынай замаху зьяўляюцца палітычныя матывы. Замаховец перад замахам папракаў Азіс-хана ў тым, што ён спрыяў, каб Афганістан быў выдан ангельцам. Кемаль Сізд зараз-жа быў затрыман.

* * *

МАСКВА, 7. (БЕЛТА). У сувязі з атрыманым паведамленьнем аб забойстве ў Бэрліне афганскага пасланьніка Мухамэд-Азіза, які зьяўляецца стрэйшым братам кораля Афганістану МУХАМЭД-НАДЫР - ШАХА, старшынёю ЦВК СССР тав. М. І. КАЛІНІНЫМ паслана 7-га чэрвеня тэлеграма МУХАМЭД НАДЫР-ШАХУ з выказам спачуваньня.

Апрача таго, міністру замежных спраў Афганістану пасланы тэлеграмы з выказам спач

МАШЫНЫ—УБОРАЧНАЙ

Белсельснаб зрывае выпуск запасных частак да ўборачных машын

„ЗВЫШ МЭХАНІЗАТАРЫ“ З БЕЛСЕЛЬСНАБУ

Канец сьнежня. Гаспадарнікі, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі рыхтаваліся да выкананьня тых задач, якія былі пастаўлены партыяй і ўрадам перад кожным сацыялістычным прадпрыемствам.

Загадчык аддзелу збыту арцелі «Чырвоны інвалід» Нэйфах таксама разумеў гэтыя задачы. І дзеля таго, што заказаў на выраб запасных частак ня было, ён пашоў шукаць спажыўца сам. Перш за ўсё ён зашоў у Белсельснаб і паведаміў аб тым, што іх заказы на 1932 год выкананы і што неабходна заключыць новы дагавор. Нэйфаха ў Белсельснабе ўважліва выслухалі, падзякавалі за паведамленьне і далі наступны адказ:

— Ведаеце што, таварыш Нэйфах, цегліны ствараць мы ня будзем, а стары дагавор на выраб запасных частак можа заставацца ў моцы і на новы год. Навошта займацца пісаніной і дарэмнай тратай часу?..

— А можа попыт на запасныя часткі ў 1933 годзе павялічыцца, можа дадасьцё да старога дагавору?—прасіў Нэйфах.

—Не, не. Зьмен ніякіх не прадбачыцца. Выконвайце той заказ, які вам дан на 1932 г.

Старшыня арцелі «Чырвоны інвалід» Канзўнікаў згодзен быў з устаноўкай Белсельснабу. І таму, што на выкананьне старога дагавору не патрабавалася асаблівых тэмпаў, згадзіўся з Белсельснабам і сакратар партыйнай ячэйкі Рамейка і старшыня заўкому Хмялеўскі.

— Ды мы-ж гэты заказ—гаварылі яны, — выканаем бяз усякай мабілізацыі мас!

А трэба было зрабіць да ўборачнай кампаніі шасьцярэнь да жнярак у наступнай колькасьці: чатырнаццацізубных—1.500 шт., адзінаццацізубных—3,5 тыс. шт., дзесяцізубных—1.000 шт. і падвойных перадатачных—100 шт. Шасьцярэнь Р.97—100 шт. і Р.1071 — 100 шт., Р.1064—50 шт.

Для выробу гэтай колькасьці запасных частак «Чырвонаму інваліду» патрэбна ня больш 3-х месяцаў. Потым заказы неабходна шукаць. Вось кіраўнікі арцелі і выразьлі сваю праграму расьцягнуць на цэлы год.

— Мы, брат, навучаны горкім вопытам,—гаварылі яны. — Па месяцу стаялі з прычыны адсутнасьці заказаў. Лепш патроху, а каб капіла работы на ўвесь год.

Тэмпы «Чырвоным інвалідам» наўмысьла запрымліваюцца. А тут з Белсельснабу гэтымі днямі ў арцель прышоў інструктар і заявіў:

— Спыніць выраб чатырнаццаці і дзесяцізубных шасьцярэнак.

— У чым справа, што-ж мы будзем рабіць? — пыталі кіраўнікі арцелі.

— Зараз жняркі выпускаюцца новай канструкцыі і да іх гэтыя часткі не падыходзяць—тлумачыў інструктар.

— Ну, а старыя рэмонтаваць не патрэбна?

— Што старыя, усе старыя трэба здаць на ўцёл. **Нам патрэбны новыя машыны ў сельскай гаспадарцы.**

Арцельшчыкі замяшаліся. Яны ня ведалі, што ім прыдзецца рабіць на працягу бліжэйшага часу.

— Ну, а калі-ж вы выканаеце гэты маленькі заказ? — запыталі мы ў загадчыка аддзелу заказаў Паўлоўскага, які, доўга ня думаючы, даў адказ:

— Да канца году выканаем.

Як бачыце, сьпяшацца няма чаго. Белсельснаб ня даў ніякіх тэрмінаў выкананьня іх заказаў. Ці не забыліся ў Белсельснабе аб падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі?

А. МАНЬКОЎ.

ЗНАЙСЬЦІ І ПАКАРАЦЬ ВІНАВАТЫХ

Намесьнік дырэктара Белмэталяваб'яднаньня Шоўкаў скардзіцца на тое, што Наркамзем Беларусі не дае заказаў на рэмонт уборачных машын і на выраб новых запасных частак. Шоўкаў разумее, што ад спазчасовай падрыхтоўкі машын, забесьпячэньня іх запаснымі часткамі будзе залежыць посьпех уборкі ўраджаю.

— Мы маглі-б на мэталязаводах—гаворыць ён—адрамантаваць значную колькасьць машын і зрабіць запасныя часткі да гэтых машын. Але-ж ніяк ня можам дабіцца таго, каб своячасова быў дан заказ.

Намесьнік наркома земляробства тав. Стрэле весьці абурэнне заявай Шоўкава. Ён даводзіць, што і тыя заказы, якія былі даны мэталязаводам, значэньня ня выконваюцца.

Як бачыце, вінаватага няма. Кіраўнікі звальваюць віну адзін на другога, а справы ня відаць. Вось факты. Нядаўна мэталяваб'яднаньню быў дан заказ на выраб 200 колаў да жнярак. Аб'яднаньне пераслала гэты заказ менскаму заводу імя Варашылава, які павінен да 20 чэрвеня ўжо здаць першую партыю колаў у 30 шт. Аднак, на заводзе не сьпяшаюцца з падрыхтоўкай да выробу гэтых важнейшых частак. Яшчэ дагэтуль ня зроблены мадэлі.

Між тым рабочыя ня ведаюць, што іх завод абавязан у тэрмін здаць 200 колаў. Старшыня заўкому тав. Андрэеў на запытаньне, што вы думаеце зрабіць для хутчэйшага выкананьня заказу, адказаў:

— Ніякіх дырэктыў па гэтым пытаньні з ЦП саюзу я не атрымліваў. Наколькі мне відома, ЦП пярэчыць выпрацоўцы колаў на заводзе імя Варашылава.

Такія ацінныя адносіны да рамонту сельска-гаспадарчых машын і выробу запасных частак цельга інакш кваліфікаваць, як пэлькананьне пастаноў партыі і ўраду па гэтым пытаньні.

А. Л-кі.

Аб самаабкладаньні сельскага насельніцтва на 1933 г.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

У разьвіцьцё пастановы ЦВК і СНК СССР «Аб самаабкладаньні сельскага насельніцтва на 1933 год» («Известия ЦИК СССР и ВЦИК» за 1933 год № 133), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Устанавіць, што самаабкладаньне праводзіцца таксама на ўсіх мястэчках і ў сельскіх паселішчах, якія знаходзяцца ў межах гарадоў.

2. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам, Менскаму, Віцебскаму і Гомельскаму гарсаветам неадкладна разгарнуць шырокую агітацыйна-масавую работу па папулярызацыі закону аб самаабкладаньні.

3. Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў даць неабходныя ўказаньні раёнам аб парадку і тэрмінах правядзеньня самаабкладаньня.

4. Скасаваць пастанову ЦВК і СНК БССР ад 29 жніўня 1932 г. «Пра самаабкладаньне сельскага насельніцтва» (З. З. ЦВК БССР 1932 г., № 55, паст. 250).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. БЭНЗІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

7 чэрвеня 1933 г.

Жывыя парасяты на калгасным базары ў Смаленску

Ва ўсеузбраеньні сустрэць загатоўкі

Пастанова партыі і ўраду аб абавязковых пастаўках ўнесла карэнныя вымены ў сыстэму збожжазагатовак. Плян загатовак, асноваі якога служылі раней кантрактацыйныя дагаворы, пераварыўся зараз у непарушны закон. Вось гэта асаблівасьць новых умоў загатовак выклікала некаторае самазаспакаеньне ў некаторых раённых работнікаў: «Раз ёсьць закон, раз ужо прадугледжаны цьвёрдыя нормы, раз вызначаны рэпрэсіі да невыканаўцаў закон—дык непакоіцца няма чаго—ўсё пройдзе гладка».

Гэта глыбока памылковыя погляды, якія могуць прывесьці да вельмі дрэнных вынікаў. Яны выцякаюць з перажытых цяперашніх абставін на вёсцы, з недаацэнкі значэньня арганізацыі загатовак.

Яны зьтлумляюць вынікам шкодніцкай ідэалёгіі калгасаў, перажытага таго, што цьвёрдыя пастаўкі—магутны сродак перамаганьня дробна-буржуазных тэндэнцый, якія захаваліся яшчэ ў сьвядомасьці пазасобных калгаснікаў.

Кулацтва і яго агентура вядуць і будуць весьці самую шалёную агітацыю за зрыў кампаніі. Аб гэтым нельга ні ў якім разе забываць. Эразумела, у нас ёсьць усе ўмовы для пасьпяховага завяршэньня загатовак, але гэтыя ўмовы трэба ўмела скарыстаць шляхам бальшавіцкай арганізацыі кампаніі, шляхам разгрому кулацкага сабатажу.

Важнейшым этапам падрыхтоўкі да цьвёрдых паставак зьяўляецца ўручэньне абавязацельстваў. Хутчэйшае ажыцьцяўленьне гэтай задачы забясьпечвае скарыстаньне закону аб цьвёрдых пастаўках, як вагара ўсяму ўраджайнасьці і выкананьня пасеўных плянаў.

Аднак, уручэньне абавязацельстваў па БССР ідзе яўна недавальняюча. Тэрмін даўно прашоў, яшчэ 20 красавіка, між тым дагэтуль уручана толькі 81 проц. заданьня, асабліва дрэнна ідзе работа па адпаасобным сэктары, дзе выканана 73,9 проц. плану.

Галавая задача — скарэйшае ўручэньне абавязацельстваў не пазьней **15 чэрвеня.** Да гэтага тэрміну трэба таксама скончыць праверку абавязацельстваў.

У гэтым годзе мы павінны так арганізаваць загатоўкі, каб **у першай палове сьнежня скончыць кампанію.** Такую дырэктыву дала ўсесаюзная хлебная нарада. Ліпень і жнівень павінны даць збожжа ў два разы больш, чым летась. Таму, хуткае і выразнае правядзеньне ўборкі, выразкі хлеба з палёў і абмалоту—рашаючыя зьвены падрыхтоўкі за здачы збожжа.

Выключна важнае значэньне набывае барацьба з расьцрадваньнем ураджаю. Трэба ліквідаваць усе спробы клясавага ворага працягнуць свае рукі да ўраджаю. Закон аб ахове сацыялістычнай маемасьці павінен стаць вострай зброяй барацьбы за захаваньне збожжа.

Выключна важнае значэньне набывае барацьба з расьцрадваньнем ураджаю. Трэба ліквідаваць усе спробы клясавага ворага працягнуць свае рукі да ўраджаю. Закон аб ахове сацыялістычнай маемасьці павінен стаць вострай зброяй барацьбы за захаваньне збожжа.

Загатоўчая кампанія гэтага году адрозьніваецца ад мінулагодняй тым, што скасавана прыёмка збожжа ў глыбінных пунктах. Таму вялікае значэньне мае арганізацыя сеткі ў станцыйных і прыстанцыйных пунктах, каб забясьпечыць бесьперабойную прыёмку прадукцыі.

Першачарговы абавязак кожнага калгаду, калгасьніка і працоўнага аднаасобніка — выкананьне сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. На ажыцьцяўленьне гэтай задачы павінны быць мабілізаваны ўся наша ўвага, усе сілы.

Б.

Дзе гулялі буруны

Па нашаму —
яма,
па рускі —
таксама,
па мове башкірскай —
чаляба.
Ад гэтае ямы — чалябы
паходзіць і слова —
Чалябінск.

Хто быў на хрысьціянах
галоўнейшы кум —
ня важна...
І так не памыліся, мабыць,
сказаўшы:
Чалябінскам горад
назвалі таму,
што быў для кароны
ён толькі чалябай.
Прыгнёт самаўладзтва
там грозна вісеў
над пульсам жыцьця
над кайданныя стогны...
Туды і дарогі пратоптаны ўсе
канвоем расійскай кароны.
А грозна
прыгнёт самаўладзтва
вісеў
над гэтай
так званай
чалябай...
Найлепшыя людзі
пакуту і гнеў
пранесьлі ў цяжкіх кайданах
праз Чалябінск.
А ў стэпах,
дзе вольна гуляе бурун,
дзе пасьвіцца статак
між вольнай прыроды —
башкірскі пашок
самаўладзтва бізун
трымаў,
як і рускі,
над мірным народам.
Чаго —
а бізун там
па сьпінах ходзіў,
дзе люты арол
вылятаў на спажыву...
Народ азіяцкі
пазбаўлен ня быў
ад гэтых
«культурных» уплываў.
. . . . . .
Дзе гвалт
і крывавы
разьюшаны баль
раней
самаўладзтва чыніла,
там бура Кастрычніка
ясную даль
працоўным для творчай хады
адчыніла
Савецкае Азіі
творчы настрой —
у вепах вясна
пралетарскай культуры...
Бярэм перашкоды мы
ў працы сваёй
са ўсёй
бальшавіцкай патурай.
За пяць, за чатыры
свой Захад і Ўсход
такімі дарункамі
мы адарылі,
што ўсё самаўладзтва
за тысячы год
і сотае часткі
таго не стварыла...
. . . . . .
...У 29-тым са стэпаў бурун
ішоў па Чалябінск
скрозь восень глухую...
За горадам пасьвіўся
мірна табун,
дажджы амялу
дратавалі сухую.
Ішлі інжынэры
на ўскрай па чарзе
у стэп,
дзе бурун свае посьвісты
кліка́ў...
Тады яшчэ
волат, герой — ЧТЗ
у пляне быў толькі
будоўлі вялікай...
Праз некалькі тыдняў
за горадам там,
(яшчэ і птушыны
ня скончыўся нырай)
насупар асеньнім
дажджом і вятрам
рабочы пасёлак
вырас.
Па плану разьлічаны
тэрмін гадзін,
ударніцтва брала
за меней гадзінаў...
Там рускі,
башкір,
армянін і грузін —
праняты былі
парывальным адзіным:
каб гонарам
творчага пафасу спраў
была іх
ударная праца...
Савецкі асілак
на ногі каб стаў
у тэрмін...
Таму —
пастарацца!
Каб чуць яго сэрца,
каб плаўкую кроў
ваграмкі па венах
у формы пасілі...
На хлебнае заўтра
калгасных палёў
памножыць хутчэй
яго творчую сілу.
Мацней палівалася
бурай жыцьцё,
вялікае творчае сілы...
Калгасьнік,
калгасьніца,
сьлесар,
шахцёр,
бэтоньчык,
каваль —
тут упарта рашылі:
пайсьці у далейшы
нястрымны паход,
узброіцца
новаю творчаю зброяй...
«Умеем-жа мы
будаваць свой завод,
дык паўчымся, значыць,
варштаты асвоіць».
Дык, значыць, ударнік,
Хутчэй асваяй,
над цэхрай ранейшай
пастаўшы «нігель»...
Дык будзем вучыцца,
дык курсы давай
чырвонае ўдарнае кніг!
«У цэх пазнесем мы
ўмкненьне сваё,
традыцыі ўдарных паходаў...
На хлебнае заўтра
калгасных палёў
памножым мы
сілу заводу».
...А вораг навокал
ад злосьці шалеў,
вастрыў сваю зброю
да ціхага бою.
Хацеў ён пачуць
пульс заводу... але
в сьмяртэльным яго нерабоем.
І кідаў
вужачую злосьць
супарат,
тады,
як ні разу ніколі,
калі,
каб асвоіць
свой новы варштат,
засеў за вучобу
ударнік будоўлі.
Далі мы адпор
супарату свайму
па-бальшавіцку,
рашуча...
Ад нас не схаваць
свайго зроку яму,
зубоў не схаваць...
Яго сьмерць пазбегнуча.
Адзоўся прастор
у бэтон і граніт,
дзе так вось нядаўна
гулялі буруны...
Там сэрца асілка
магутна грыміць,
і пырскае сонцам камуны.
Дзе колісь прынёт
самаўладзтва вісеў
над даўняй
панурай чалябай, —
цяпер
набылі новы выгляд усе
дарогі
на новы Чалябінск.
Савецкае Азіі
творчы настрой —
вясна пашай новай
вялікай культуры...
Бярэм перашкоды мы
ў працы сваёй
са ўсёй
бальшавіцкай патурай.

На шпальтах газэт СССР

НОВЫЯ БАВАЎНЯНЫЯ СУШЫЛКІ

На заводах Саюзгазатбавоўны будуюцца новыя бавоўняныя сушылкі стужкавага тыпу. Сушылкі будуць абслугоўваць новыя бавоўняныя раёны Паўночнага Каўказу, Украіны і Закаўказьня. Асноўная іх вартасьць у тым, што яны максымальна ўдаляюць вільгаць—да 15 проц. Амэрыканскія-ж сушылкі ўдаляюць ня больш 10 проц. вільгаці. Сушылка стужкавага тыпу прапускае ў суткі каля 90 тон сыр-цу. Да апошняга часу на Украіне, Закаўказьзі і на Паўночным Каўказе для сушкі сырцу карысталіся саматужнымі машынамі, якія прапускаюць ня больш 1,5 тон сырцу ў суткі.

(«Правда Востока»).

ПРЫЕЗД ВУЧОНЫХ І ПІСЬМЕНЬНІКАЎ З-ЗА МЯЖЫ

У бліжэйшы час у Маскву прыяжджае рад замежных пісьменьнікаў, артыстаў і навуковых дзеячоў. З Англіі ўжо прыехаў прафэсар фізыкі Кембрыджскага унівэрсытэту А. Вуд. З Амэрыкі прыяжджае член амэрыканскага расійскага Інстытуту ў Сан-Францыско А. Грын. З Літвы прыяжджае прафэсар філёзофіі і педагогікі Сэйзман, а Латвіі—вядомы мастак-ілюстратар Струмке. Чакаецца прыезд вядомага шведзкага пісьменьніка Рольфа Стэнэрсона. Гэтымі днямі з Амэрыкі прыяжджаюць дзьве тэатральныя групы на чале з вядомымі тэатральнымі дзеячамі Клурманам і Адэвэрам Сэйлёрам («Вечерняя Москва»).

САВЕЦКІЯ СПЭЦЫЯЛІСТЫ ПРАЕКТУЮЦЬ ПЕРШЫ ТУРЭЦКІ ТЭКСТЫЛЬНЫ КАМБІНАТ

У ліх крэдыту на прамысловае будаўніцтва ў 8 мля. руб., адпушчанага савецкім ўрадам Турцыі, у першую чаргу будуецца вялікі тэкстыльны камбінат у с. Кайсарыя. Для праектаваньня камбінату, абсталяваньня яго савецкімі машынамі створан спэцыяльны трэст «Туркстрой». Гэтымі днямі адбылася афіцыяльная перадача распрацаванага эскізнага праекту тэкстыльнага камбінату Турэцкай урадавай камісіяй, якая знаходзіцца ў Маскве. Камбінат будзе складацца з бавоўняна-папяровай, пradзільнай, ткацкай і апрэтурнай фабрык, [illegible] насьць пradзільнай фабрыкі першай чаргі—33 тысячы верацён, ткацкай—1 тыс. аўтаматычных варштатаў. Праект прадугледжвае пабудову электрастанцыі для камбінату. Камбінат павінен даць звыш 30 мля. мтр. тканіны ў год. Такім чынам, будзе створана буйная галіна турэцкай нацыянальнай прамысловасьці. («ЛЕГКАЯ ИНДУСТРИЯ»).

„Мы з вамі, таварышы рабочыя і сяляне СССР!“

(Гутарка дэлегацыі шведзкай сэкцыі Чырвонага Спартыўнага Інтэрнацыяналу з карэспандэнтам „Зьвязды“)

Наш карэспандэнт маў гутарку з прыехаўшай на ўсебеларускія І ўсесаюзныя спаборніцтвы па цяжкай адлётыцы і гімнастыцы ДЭЛЕГАЦЫЯЙ ШВЭДЗКАЙ СЭКЦЫІ ЧЫРВОНАГА СПАРТЫЎНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ т. т. ІЕКІЯГА (рабочы бэтоньчык), КАРЛЬСОНАМ (грузчык-беспрацоўны) і ЭРЫКСОНАМ (рабочы шофэр). Дасобнай паездзі.

— Глыбокі эканамічны крызіс—заявілі дэлегаты—які ахапіў усе капіталістычныя краіны, не мінаваў, эразумела, і Швецыю. За апошнія гады рэзка скараціпася прадукцыя шведзкай прамысловасьці. У параўнаньні з 1929 годам выпуск прадукцыі за чацьверты квартал 1932 году скараціўся на 30 проц. Асабліва скарачэньне прадукцыі адчуваецца ў прамысловасьці, якая працуе на экспарт, і ў выробе машын. Экспартная вытворчасьць зьнізілася на 36 проц., выраб машын—на 39 проц.

Лік беспрацоўных дасягнуў у красавіку бягучага году звыш 300 тысяч чал., што складае капя 40 проц. усіх рабочых, аб'яднаных у прафсаюзах. Але нават і тыя рабочыя, якія яшчэ знаходзяцца на вытворчасьці, таксама фактычна зьяўляюцца поўабеспрацоўнымі. Па апошніх данных, 100 тысяч рабочых працуюць толькі па два-тры дні ў тыдзень, а то і менш. У Паўночнай Швецыі, напрыклад, у раёне Кіруну рабочыя-гарнякі працуюць толькі па 9-9½ аўмен у месяц. Рэшту часу яны ходзяць беспрацоўнымі, прычым зарплата выплачваецца толькі за фактычна адпрацаваны час.

Зарплата рабочых у 1932 годзе па параўнаньню з мінулым годам яшчэ больш зьнізана: па мэталяпрамысловасьці, якая яднае 100 тыс. рабочых,—на 6 проц., па лесапільнай (35 тыс. рабочых)—на 9 проц., сельска-гаспадарчых рабочых (100 тыс. чал.)—на 13 проц. У лютым 1933 году рабочым горнай прамысловасьці зарплата зьнізана на 8 проц., прамысловасьці будматэрыялаў на 10 проц. і г. д.

Акрамя гэтага, у радзе раёнаў прадпрыемцы-капіталісты зьнізілі зарплату па лёкальных калдагаварах на сваіх фабрыках і заводах на 22-25 проц. супроць зарплаты 1931 году.

Падаткі павышаны. Зараз сацыял-фашысцкім урадам уведзены новыя падаткі на малако, муку, тутун, гатовую [illegible] і інш. Гэта кладзецца [illegible] на вялікім цяжарам на шыю рабочых і працоўных сялян.

Усе абяцаньні, якімі карысьлі беспрацоўных сацыял-фашысцкія правадыры, што сядзяць на ўрадавых крэслах, аказаліся пустымі звонам. Дапамога беспрацоўным скарочана да мінімуму. З 300 тысяч беспрацоўных дапамогу атрымліваюць менш тысячы чалавек.

Усё гэта абумоўлівае няўхільны рост рэвалюцыйнага руху сярод рабочых і працоўных мас краіны. Лік стачак і сутычак з паліцыяй узрастае. Першыя пяць месяцаў бягучага году адзначаны радам забастовак (маракоў, гандлёрага флёту, дэсантуваў, сельска-гаспадарчых рабочых, тэкстыльшчыкаў і інш.).

Ва ўмовах страшэннай галечы і далейшага зьбяднеьня мас, калі рабочыя мруць з голаду і ня маюць прытулку, сацыял-фашысцкі ўрад замест дапамогі беспрацоўным траціць сотні мільёнаў крон на ўзбраеньне. На 1933 год бюджэтом прадугледжана на ваенныя расходы 108 мільёнаў крон. Гэта толькі пераводзе афіцыяльных данных, а колькі траціцца неафіцыяльна!

Хапае сродкаў і на ўтрыманьне нарала Густава V. Паводле афіцыяльных вестак, на ўтрыманьне кэрапэўскай сям'і адпушчана 1.600 тыс. крон. Гэтай сумы магло-б хапіць на выдачу дапамогі 3.000 беспрацоўным на цэлы год! Але што сацыял-фашысцкаму ўраду да беспрацоўных?

Па ініцыятыве сацыял-фашыстаў, якія знаходзяцца ў габінеце міністраў, ніадзна створана новая, так званая дзяржаўная паліцыя (жандармерыя), на ўтрыманьне якой таксама траціцца шмат мільёнаў крон. Гэта паліцыя пры значнай спэцыяльна для барацьбы з рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі і ўзброена паводле апошняга слова вайсковай тэхнікі (сьлёзатачывымі бомбамі, кулямётамі, танкетамі і нават самалётамі).

У гэтых умовах упушу шведзкай кампартыі ўсё больш узрастае. За 1932 год камуністычная партыя і камсамол вырасьлі на 10.000 чалавек. У той-жа час назіраецца сыстематычны адыход рабочых ад сацыял-дэмакратыі і рост левай прафэсыяцыі. У раёне Кіруну і Мальмбэргету, дзе раней панавалі сацыял-дэмакраты, зараз большасьць рабочых ідзе за камуністычнай партыяй. На першамайскай дэманстрацыі сацыял-дэмакраты ў Мальмбэргеце сабралі ўсяго 400 чал., а пад сьцягамі кампартыі дэманстравала 1.600 чалавек.

Побач з ростам кампартыі і камсамолу расьце і мацнее і шведзкая сэкцыя Чырвонага Спартыўнага Інтэрнацыяналу. Гэта адзін толькі 1932 год арганізацыя вырасла на 101 проц. Зараз рады сэкцыі ЧСІ налічваюць ужо звыш 7.000 чал., галоўным чынам рабочых.

У раёне Норботтэн (Паўночная Швецыя) у 1931 годзе было ўсяго 5 клюбаў рабочага спартыўнага саюзу, а ў цяперашні момант ужо ёсьць 34-35 клюбаў. Колькасьць клюбаў узрастае кожны месяц у адпаведнасьці з ростам ліку членаў рабочага спартыўнага саюзу (сакцыі ЧСІ).

Зараз у нашай арганізацыі ідзе ўзмоцненае спаборніцтва на заваяваньне значка «Гатоў да клясавай пралетарскай барацьбы», падобнага да нашага значка «ГТО». Па ўсіх клюбах разгорнута работа па здачы норм на значок. Гэта работа цесна ўвязваецца з падрыхтоўкай да сусьветнай спартакіяды. Разгорнута сацыяборніцтва паміж абласьцямі, гарадамі і асобнымі клюбамі.

Трэба сказаць, што клюбы і наогул рабочыя спартыўныя арганізацыі ў Швецыі працуюць у надзвычай цяжкіх умовах. У першую чаргу адчуваецца абсалютная адсутнасьць спартыўных пляцовак і памяшканьняў для работы. Муніцыпальныя пляцоўкі нам не па кішэні, па іх патрэбны вялізарныя сродкі. Дый изогул на муніцыпальныя пляцоўкі нас не дапускаюць, бачыцца «рэвалюцыйнай прапаганды».

Са сродкамі ў нас вельмі дрэнна, па колькі большасьць чаму—беспрацоўныя. У пасобных клюбах беспрацоўных складаюць 60-75 проц. (напрыклад, клюб у раёне Зэрэтарнія, дзе беспрацоўных звыш 70 проц., і г. д.).

Сацыял-фашысцкі ўрад ня толькі на ідзе насустрач рабочаму спартыўнаму руху, але надаварот [illegible] прасьледуе нашы арганізацыі. Вось характэрны прыклад: у раёне Вэрмлянд (Сярэдняя Швецыя) нашы быў арганізаван клюб і створана пляцоўка сваімі сіламі, шляхам арганізацыі спэцыяльнага суботніка. Калі пляцоўка была гатова, муніцыпальны савет пастанавіў ліквідаваць яе. Афіцыяльна матывавалі тым, што на гэтым месцы павінна адбывацца нейкае будаўніцтва, у сапраўднасьці-ж прычына іншая. Справа ў тым, што сацыял-фашысты ўбачылі, што з арганізацыяй клюбу і пляцоўкі рабочая моладзь мясцовых заводаў пачала масамі дапучацца да нас, пакідаючы буржуазныя спартыўныя клюбы.

Да рочы, аб гэтых буржуазных клюбах. Вось іх дзе ўсямерна падтрымліваё сацыял-фашысцкі ўрад. Ім даюцца розныя субсыдыі (90 тыс. крон адпускаецца гімнастычнаму саюзу, 60 тыс. крон стралковаму саюзу і г. д.).

Урад праводзіць сыстематычна і ўпарта мілітарызацыю моладзі. Для гэтага шырока выкарыстоўваюцца буржуазныя спартыўныя арганізацыі. Падамо адзін цікавы прыклад: 19 красавіка буржуазны мотаклюб у Стакгольме правёў так званае мота-спаборніцтва. Гэта былі фактычна вайсковыя спаборніцтвы. Кіраўнікамі зьяўляліся афіцэры шведзкай армії. Гэтыя «спартыўныя» спаборніцтвы праводзіліся па ўсіх правілах вайсковай тэхнікі: з вінтоўкамі, кулямётамі і іншымі відамі зброі.

Мілітарызацыя праводзіцца ўзмоцнена і ў вышэйшых школах. Вайсковыя заняткі ўведзены ў праграму вучобы і праводзяцца рэгулярна адзін раз у 6 дзён.

Сацыял-фашысты ўсімі спосабамі імкнуцца сарваць, падрыхтоўку да сусьветнай спартакіяды. Як толькі яны даведаліся пра не, два ўсіх спартыўных арганізацыях, якімі кіруюць сацыял-фашысты, забаранілі рабіць хаця-б малейшыя ўзносы на карысьць падрыхтоўкі да спартакіяды, ня кажучы ўжо аб удзеле ў ёй.

* * *

Мы нядаўна знаходзімся ў СССР. У Менск прыбылі 5 чэрвеня. Эразумела, мы яшчэ не пасьпелі многага ўбачыць. Але на нас ужо зрабіла вялізарнае ўражаньне тое, што мы бачылі за гэтыя некалькі дзён. Усюды ідуць вялікія будаўнічыя работы. Тут будуюцца дамы для рабочых, інстытуты, клюбы, бальніцы, буйнейшыя фабрыкі і заводы, новыя трамвайныя шляхі, прыводзяцца ў парадак вуліцы і г. д. Тут гадуецца новае, моцнае пакаленьне, будуецца сыстэма будучыня, бясклясавае [illegible] вас, у Савецкім саюзе няма беспрацоўных, няма крызісу. Рабочая клясa зьяўляецца гаспадаром краіны. Яна паказвае сапраўдныя цуды, паказвае, на што здольны пралетарыят, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у сваёй непахіснай волі да ажыцьцяўленьня ідэй Маркса, Леніна і Сталіна. Лепшымі сьведкамі гэтага зьяўляюцца пабудаваныя і праходзячае будаўніцтва Дняпрадэсаў, трактарных гігантаў, беламорскіх каналаў, Кузьнецкабудаў, Магнітабудаў і інш.

Дэлегацыя шведзкай сэкцыі Чырвонага Спортінтэрну

Усё гэта—ілюстрацыя пераваг сацыялістычнай сыстэмы перад капіталістычнай, сацыялістычнай пралетарскай дзяржавы перад капіталістычнай дзяржавай.

Мы ганарымся тым, што атрымалі магчымасьць быць у гасьцях у савецкіх фізкультурнікаў. Тут мы наглядна пераканаліся, што ўсе нападкі буржуазнага і сацыял-фашысцкага друку на Савецкі саюз і, у прыватнасьці, на фізкультурны рух у СССР зьяўляюцца наглейшай хлусьнёй і паклёпам.

Мы ўбачылі і пераканаліся, што ў Савецкім саюзе няма ракордсмэнства, а ёсьць агульная воля да працы, да будаўніцтва сьветлай сацыялістычнай будучыні. Гэтым задачам падпарадкаван фізкультурны рух у нашай краіне. Урад СССР клапаціцца і з вялікай увагай адносіцца да фізычнага выхаваньня працоўнай моладзі. Тут, у Саюзе Саветаў, фізкультурная арганізацыя аб тым, што ў вас фізкультурнікі за час спаборніцтва атрымліваюць поўнасьцю сваю зарплату, забясьпечваюцца сродкамі для праезду, харчаваньнем і г. д. У нас, у «культурнай» Швецыі аб гэтым, зразумела, і марыць ня прыходзіцца. Нашым фізкультурнікам трэба плаціць за кожную дробязь. А плаціць няма чым, бо, як мы ўжо адзначылі, большасьць з нас—беспрацоўныя.

Фізкультурнікі БССР і ўсяго Савецкага саюзу не рэкордсмэны, якія шукаюць, дзе «як небудзь забіць час», а зьяўляюцца актыўнымі будаўнікамі сацыялізму, лепшымі ўдарнікамі фабрык, заводаў і калгасных палёў, моцнай апорай працы і абароны пралетарскай дзяржавы.

Рабочая клясa і працоўныя Швецыі ўсё больш пачынаюць разумець перавагу сацыялізму перад капіталізмам. Таму ўсё больш растуць іх сымпатыі да камуністычнай партыі, да Савецкіх уссаюзнага падтрыманьня і дапамогі.

Урад тут забясьпечвае фізкультурнікаў пляцоўкамі, памяшканьнямі, спартыўным інвэнтаром, касьцюмамі, абсталяваньнем і г. д. Вось, напрыклад, мы ўчора бачылі пастанову Менскага гарсавету ад 5 чэрвеня, дзе мы з захапленьнем прачыталі, што фізкультурнікі на час спаборніцтваў атрымліваюць рад ільгот—бясплатны праезд на трамваі, ільготы ў тэатрах, кіно, цырульнях і інш. Мы ўжо ня кажам пра пенсіі, якія ўстаноўлены ім.

Пролетарыяту і працоўных —тав. Сталіна.

Імпэрыялісты ўсіх краін, у тым ліку і Швецыі, бачачы выхад з глыбокага эканамічнага крызісу ў вайне, у інтэрвэнцыі супроць адзінай у сьвеце пралетарскай дзяржавы—СССР. Яны з шалёным заналам рыхтуюцца да гэтай вайны. Шведзкі ўрад імкнецца арганізаваць антысавецкі блёк Прыбалтыйскіх капіталістычных краін. Невыпадкова кронпрынц Густаў-Адольф і кіраўнікі генэральнага штабу шведзкай армії прысутнічаюць на кожным вайсковым параде ў Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі і інш., выяжджаюць на манэўры, вядуць перагаворы і заключаюць пакты аб сумесных выступленьнях супроць «небясьпекі з Усходу». Невыпадкова ў м. Русэнбэрг, дзе знаходзіцца вышэйшая вайсковая школа (якой кіруе той-жа кронпрынц Густаў-Адольф), на стральковых заняткі машынямі служаць фігуры чырвонаармейцаў. Невыпадкова, што на манэўрах як сухапутных, так і марскіх, «праціўнікамі» заўсёды называюць «чырвоных».

Але пралетарыят і працоўныя масы Швецыі добра ведаюць і разумеюць, што небясьпека—ня «з Усходу», ня з боку СССР, а імённа з Захаду, з боку капіталістычных краін, дзе пануюць фашысты і сацыял-фашысты, дзе пануе зьверскі тэрор супроць рэвалюцыйных рабочых і сялян.

Мы, шведзкія працоўныя, рабочыя спартыўнай моладзь, запэўніваем пралетарыят СССР, што ўсякая спроба напасьці на сацыялістычную бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту спаткае рашучы і безьлітасны адпор з нашага боку.

Імённа гэтага і баяцца фашысцкія і сацыял-фашысцкія ўрады. Яны разумеюць, што працоўныя ў рашучы момант будуць ведаць, куды накіраваць зброю, супроць каго трэба выкарыстаць.

Мы з вамі, таварышы рабочыя і сяляне СССР!

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя!

Няхай жыве ўдарнік рэвалюцыйных рабочых спартсменаў — Чырвонага Спартыўнага Інтэрнацыяналу і яго слаўнага вялікага і кіруючага цэнтра—бальшавіцкай

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Чыстка менскай партарганізацыі пачалася

НА-ХАДУ ВЫПРАВІЦЬ НЕДАХОПЫ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ПРАВЕСЬЦІ ЧЫСТКУ ПАРТЫЙНЫХ РАДОЎ!

ХУТКА ПЕРАБУДАВАЦЦА

Сакратар партыйнага калектыву турбонасьцяжнага заводу «Бальшавік» Гелер быў усхваляваны. Ён клікаў да сябе сакратароў цехавых партыйных ячэек, старшынь цехкомаў і ў вожнага пытаў:

— У чым тут справа?

Тыя паціскай плячыма. Яны апраўдвалі сябе колькасьцю вывешаных лёзунгаў па цэхах, колькасьцю сказаных прамоў на сходах.

У залі беспартыйных рабочых амаль ня было. Ня ўсе прыйшлі і члены партыі і камсамольцы. Мінуты складалі гадзіну. Сход яшчэ не пачынаўся, чакалі «мо' падойдуць». Праз паўгадзіны «падыйшлі», але нязначная колькасьць.

— Можна пачынаць, больш, бастай, ня будзе, — сказаў сакратар партакому. Чырванеючы цехавыя сакратары, як, уласна кажучы, не чырванець, бачылі першы сход, прысьвечаны праверцы і чыстцы парторганізацыі заводу, не забясьпечылі стопроцантнай явкай партыйцаў, камсамольцаў і беспартыйных рабочых? З залі чуцны былі галасы:

— Кепска растлумачылі брыгадам.

Супроць гэтага ніхто з кіраўнікоў цярэчыць ня мог.

Адкрываючы сход, старшыня праверкому тав. Блоўштэйн спыніўся на тых задачах, якія стаяць перад кожным партыйцам і камсамольцам, перад кожным сьвядомым беспартыйным рабочым у часе чысткі.

Пасьля прамовы старшыні праверкому, з дакладам аб рабоце партарганізацыі заводу выступіў сакратар партыйнага калектыву тав. Гелер. Ён расказаў аб геройнай барацьбе большасьці камуністаў і камсамольцаў за праміфіцыян, аб іх авангардным ролі на вытворчасьці.

— Я не магу зразумець, — гаварыць тав. Гелер, — чаму ў нас сёньня такая недысцыплінаванасьць? Тут у першую чаргу вінаваты мы самі. Мы не смелі як сьлед растлумачыць рабочым значэньня чысткі партыі. Як магло здарыцца, каб наша арганізацыя, пад кіраўніцтвам якой за год на працягу двух гадоў перавыконвае свой план, не забясьпечыла стопроцантнай явкі беспартыйных рабочых?

За 1932 год мы заданьне па выпуску прадукцыі выканалі на 110,85 проц. За чатыры месяцы бягучага году нашае заданьне выканала ў колькасным азначэньні на 101,18 проц. і ў цэнасным на 105,55 проц. Наш завод атрымаў за перамогі пераходны сьцяг ЦКСПБ.

Ня выканан нашае адзін важнейшы паказальнік плану — гэта зьніжэньне сабекошту. Замест зьніжэньня мы маем павышэньне сабекошту на 14 проц.

Далей тав. Гелер спыняецца на тым, што за апошнія два гады партыйная арганізацыя заводу вырасла на 113 чалавек.

— У нас 65 кандыдатаў і работа з імі пастаўлена дрэнна. 12 чалавек дагэтуль не наведваюць партыйных школ.

Канчаючы дакład, тав. Гелер заклікаў партыйную арганізацыю разгарнуць шырокую самакрытыку, ня гледзячы на асобы, і гэтым дапамагчы праверкому выкрыць усё гнілое, што перашкаджае партыі ў барацьбе за сацыялізм.

Пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі. Выступаючыя гаварылі, што жэлтыцны цэх з месяца ў месяц ня выконвае вытворчай праграмы, таму што кіраўнікі цэху Тычачэў, Розенбэрг і Камільскі пяздолны як сьлед змагацца за генеральную лінію партыі. Бюро партыйнага калектыву лібэральна адносілася да гэтага, ня прымала рашучых мер у адносінах да кіраўнікоў, членаў партыі.

Ня прымаліся меры да партыйцаў Левінай, Нарочынай, Рясэніча, Гальтмана і інш., якія сыстаматычна выпускалі бракаваную прадукцыю.

Парторгі Рулакоўскі і Пятроў ня здолелі арганізаваць сваіх брыгад на выкананьне вытворчай праграмы. Парторгі Абрамовіч і Рапапарт таксама ніякай работы ў брыгадах не праводзяць.

Шмат гаварылі рабочыя аб дрэнным пастаноўцы работы па марксыцка-ленінскім выхаваньні членаў і кандыдатаў партыі. На заводзе былі факты антысэмітскіх і шавіністычных выказак нават з боку цехавых членаў партыі. Антысэмітты Абрамзяніч, Анісімаў, Кудраванка і яўрэйская шавіністка Лібэрман, прыкрываючыся партыйнымі білетамі, праводзілі яўна контр-рэвалюцыйную агітацыю сярод адсталых рабочых. Партыйная арганізацыя заводу не ўжыла гэтых фактаў на прынцыповую палітычную выпнню, не скарыстала іх для выхаваньня партыйнай і камсамольскай арганізацыі і ўсяго рабочага калектыву заводу.

Выступаючы ў спрэчках тав. Добрыдні спыняецца на тым, што цэхавыя партыйныя ячэйкі часам ня ведаюць людзей, з якімі яны працуюць. Ён прыводзіць факт, што ў механічнай майстэрні работы Грушчэўскі лічыцца кандыдатам партыі з 1924 году і ніхто аб гэтым ня ведае. А вось тав. Кагаў гаворыць, што гэты стары кандыдат партыі ніяк не хацеў падпісацца на пазыку. І што член партыі Курэўскі нішчага ўдзелу ў грамадзкім жыцьці заводу ня прымае, што ён кепска адносіцца і да працы на вытворчасьці.

Выступаўшыя крытыкавалі тых партыйцаў, якія не паказваюць прыкладу работы на вытворчасьці.

Гэты першы сход, як нельга лепш, паказаў, да чаго даводзіць самазадаваленьне і самашчэк. Посьпехі крыху ўскружылі галовы кіраўнікам «Бальшавіка». Яны зенадта паспадзяваліся на свае сілы і вялікае мала зрабілі для падрыхтоўкі да сходу на чыстцы сваёй партарганізацыі. Усе дасягненьні «Бальшавіка» на гаспадарчым фронце тлумачацца ўдартай штодзённай партыйна-масавай работай у цэхах і брыгадах. Нездавальняючая ідэйна сход на чыстцы тлумачыцца тым, што вакол растлумачэньня задач чысткі партыйна-масавая работа вялася слабо.

Гэта павінна ўлічыць кіраўніцтва партакалектыву «Бальшавіка», каб у далейшай рабоце па чыстцы даказаць, як яны злосныя хутка на-ходу выпраўляць свае памылкі.

А. М.

ПАКАЗАЛЬНІК ЧЫНОЎНІЦКІХ АДНОСІН ДА ЧЫСТКІ ПАРТЫІ

Партыйны калектыў Менскага чыгуначнага вузла сустрэў чыстку партыі зусім непадрыхтаваным. Аб гэтым ясна сьведчыць зрыў першага сходу, прысьвечаны чыстцы, які павінен быў здбыцца 5 мая. Замест 136 камуністаў з паравознага дэпо, на сход зьявілася толькі каля паловы.

Прыхуднасьць беспартыйных рабочых выявілася ня больш, як у дзесятку чалавек.

Гэта здарылася таму, што кіраўніцтва партыйнага калектыву дэпо на чале з сакратаром тав. Шота, бяздушна, папартыкністычнему аднеслася да чысткі партыі. Адсутнасьць належна праведзенай растлумачальна-масавай работы аб значэньні чысткі сярод беспартыйных рабочых ёсьць вынік няўвагі іх на сход.

Зрыў сходу наглядна паказаў прытуленьня партыйнай чупасьці ў кіраўніцтва парткалектыву дэпо і безадказныя адносіны да правядзеньня ў жыцьці важнейшых дырэктыў партыі.

Менскім гаркомам КП(б)Б 6 мая вынесена адпаведная пастанова ў адносінах кіраўніцтва парткалектыву дэпо. Але гэтага мала. Гэты канкрэтны факт трэба ўлічыць астатнім партыйным арганізацыям гораду, каб надаць чыстцы сапраўды бальшавіцкі характар. Н.

З апошняй пошты

АЗНАЁМЦЕСЯ СА СТАТУТАМ ПАРТЫІ

Сёньня мы апрымаці сеньненскую раённую газету «Камунар» № 71(252) за 1-е чэрвеня. На першай старонцы гэтага нумару надрукавана пастанова РК і РВК «аб ходзе сяўбы» за 30 мая.

І вось у разьдзеле «РК і РВК пастанаўляюць» першым пунктам ідзе на ступнях:

«Старшыню Новасельскага сельсавету № 1 тав. Сокалава, сваёй бязьдзейнасьцю і расхлябанасьцю сарваўшага сяўбу ў сельсавеце за ўсе апошнія дні, з работы зьняць і ДАРУЧЫЦЬ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ ТШЧАЦЕЛЬНА РАЗАБРАЦЬ ПЫТАНЬНЕ АБ МАГЧЫМАСЬЦІ ЯГО ПРАБЫВАНЬНЯ Ў ПАРТЫІ»... (Падкрэсьлена намі. Стыль іх. РЭД.).

У сувязі з гэтым пунктам пастановы мы хочам задаць тры пытаньні сакратару Сеньненскага РК КП(б)Б т. ЛЕНЦНАРУ і старшыні РВК тав. БРЭЛЬ.

ПЕРШАЕ: З якога гэта часу раённая камісія па чыстцы партыі, якая прызначана непасрэдна рэспубліканскай камісіяй і ёй цалкам падпарадкоўваецца, зна ходзіцца пад кіраўніцтвам РК і РВК, што дазваляе апошнім даваць ёй свае «даручэньні»?

ДРУГОЕ: Чаму таварышы з Сяло сумняваюцца ў якасьці работы раённай камісіі па чыстцы Сеньненскай партарганізацыі і пічаць патрэбным спэцыяльна ў сваёй пастанове «даручаць» камісіі «тшчацельна разабраць» справу тав. Сокалава?

ТРЭЦЯЕ: Ці ўсе члены Сеньненскай партарганізацыі будуць праходзіць чыстку ў «тшчацельным парадку» ці толькі тыя, аб якіх будуць спэцыяльныя пастановы РК і РВК?

Нарэшце, мы раім кіраўніцтву раённу самім узяцьліва прапрацаваць інструкцыю па чыстцы і знаёміць з арганізацыйнай пабудовай партыі, бо ім таксама прыдзецца праходзіць чыстку ў Сеньненскай арганізацыі і сеньненская-м камісія можа зусім за конна задаць такое пытаньне.

Адсутнасьць партыйнай вучобы — галоўны недахоп

Як толькі зьявілася ў друку пастанова ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы партыі, на Менскай электрастанцыі адразу-ж разгарнулася падрыхтоўчая работа. Сход калектыву, сход палавых ячэек, даклады, гутаркі былі першым крокам у падрыхтоўцы. Галоўная ўвага аддавалася разгортаньню сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, павышэньню авангардзкай ролі камуністаў на вытворчасьці, арганізацыі партыйнай вучобы.

Раней на электрастанцыі (пры старым кіраўніцтве) панавала безгаспадарчасьць. Электрастанцыя ня выходзіла з палясы прарываў. Амаль кожны дзень выкідвалася сьвяцло ў горадзе. Новае кіраўніцтва — новы дырэктар і сакратар парткалектыву — пры дапамозе ўсіх рабочых выкрыла сапраўдныя прычыны гэтых прарываў. Электрастанцыя прадавала дрэнна толькі таму, што на рашаючых вузлах работы сядзелі кулакі. І яны, выкарыстоўваючы блізарукасьць кіраўнікоў, рабілі тое, што маглі, каб сарваць выкананьне праміфіцыяльнага плану, каб запнаць электрастанцыю ў тупік.

На чале з новым кіраўніцтвам парткалектыву, пры ўдзеле ўсіх рабочых, правёў самаачыстку электрастанцыі ад клясова-чужых элементаў. Выкінута 70 асоб. Дзесяць пікетэкаў адданы пад суд. Рабочыя мабілізаваны на ліквідацыю прарываў.

І работа пайшла значна лепш. Праміфінплян за пяць месяцаў 1933 году па якасьці выкананы на 100 проц., а па колькасьці на 94 проц. Пушчан у строй пяты казёл. Асвоен спосаб спальваньня фрэзернага торфу. Вев дапамогі замежных спэцыялістаў з посьпехам праведзена праверка ангельскай турбіны. Пучпчан у эксплёатацыю дызэль «МАН», пабудована новы склад шлаку і г. д. Пракладзен і адзін у эксплёатацыю 3-мы фідэр, які забясьпечыў бесьперабойную падачу электраэнэргіі хлебазаводу і іншым прадпрыемствам Менску.

Посьпехі немалыя. Але разам з гэтым ёсьць яшчэ і вялікія недахопы. Перабой у снабжэньні сьвяцлом, ісьць і рэдка, але яшчэ паўтараюцца.

Вельмі дрэнна пастаўлена на электрастанцыі партыйная вучоба. Толькі перад чысткай парткалектыў прыняў некаторыя меры і камуністы пачалі наведваць школы.

* * *

5 мая камісія па чыстцы КП(б)Б пад старшынствам тав. Хадасэвіча распачала сваю практычную работу на электрастанцыі.

У клюбе першы сход. На сходзе прысутнічаюць амаль усе рабочыя электрастанцыі, заля перапоўнена. Тав. Хадасэвіч на ўступнай прамове досыць падрабязна і глыбока растлумачыў задачы чысткі. Пасьля гэтага сход з вялікай увагай выслухаў даклады сакратара ячэйкі машына-кацельнага цэху тав. Бэйтрука і сакратара калектыву тав. Шкупака. У спрэчках, апрача сакладу праверачнай брыгады, выступілі 23 чалавекі.

Як-жа працавала ячэйка машына-кацельнага цэху? На мецінгу на тое, што гэта ячэйка на электрастанцыі ліквідавала аўзучай, апорнай, яна прадаваль горш, чым іншыя. Большасьць тамашняй ячэйкі на працягу ўсёй зімы не наведвала партыйных школ. Сакратар ячэйкі тав. Бэйтрук замест таго, каб арганізаваць партыйную вучобу ціла хам масовай работы, займаўся і займаецца голым адміністраваньнем.

— Або ідзі ў школу, або кладзі партыйны білет, — на тонкім кроку боек нашу камуністу заявіў Бэйтрук.

Да зьмяшчэньня ў друку пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы партыі партыйная вучоба на электрастанцыі ніякая амаль на было. Большасьць кандыдатаў КП(б)Б ёсьць палітычна неграмотнымі. На электрастанцыі ёсьць адзін кандыдат нават з 1929 году, два з 1930 і 11 чал. з 1931 году. Ёсьць 15 членаў партыі з 1917 году, пам. пракурора Вярхоўнага суда БССР.

МЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

* * *

6 мая з 5 да 7 гадзін вечара адбываліся спрэчкі па дакладах сакратара калектыву і сакратара ячэйкі машына-кацельнага цэху. Потым пачалася індывідуальная чыстка камуністаў.

— Будзе правяраць тав. Спапінскі,— абвясьціла старшыня камісіі.

Тав. Спапінскі на прыбуце. Ён коратка расказвае свой пройдзены шлях.

— Член партыі з 1907 году. Бацька быў рабочы. Сам я — таксама рабочы з малых год.

— Прымаў удзел у рэвалюцыйным руху да 1907 году. З 1910 па 1913 год за рэвалюцыйную работу сядзеў у турме.

— Зараз, ня гледзячы на тое, што я зьяўляюся інвалідам першай групы, ста раюся актыўна працаваць у КП(б)Б і ў грамадзкіх арганізацыях.

Тав. Спапінскі члена таварыства старых бальшавікоў.

— Якія будуць запытаньні да Спапіна скага? — пытае Хадасэвіч.

— Дазвольце слова! — пачуўся голас з месца.

— Я толькі хачу сказаць адно, — гаворыць рабочы электрастанцыі тав. Масэвіч, — трэба пажадаць тав. Спапінскаму яшчэ доўгіх год барацьбы на карысьць сацыялізму. І ўсім нам трэба вучыцца ў яго, трэба працаваць так, як працаваў і працуе гэты стары бальшавік.

Наступным выклікаецца тав. Сячко. Кандыдат КП(б)Б з 1930 г. Працуе на электрастанцыі з 1928 году. Сын сялянына-сярэдняка.

— Ці чытаў пастановы партыі аб калгасным ладзе? — запытвае тав. Хадасэвіч.

— Чытаў, але нічога не зразумеў, — гаворыць Сячко.

І такім адказы ад Сячко паступалі на ўсе пытаньні. Ён казаў ня ведаў, што такое сталуг партыі, ня казычы ўсяго па праграме. Кандыдат КП(б)Б Сячко па палітычным разьвіцьці адстаў на некалькі год нават ад іншых беспартыйных рабочых. На пытаньні Сячко не падпісаўся.

І гэта практычны вынік адсутнасьці масавай работы ў машына-кацельным цэху.

Правяраецца член КП(б)Б з 1931 году тав. Бузоўскі. Члены камісіі задаюць яму некалькі сусім элементарных пытаньняў, але ён не дае на іх адказу.

— Ну, а як у цябе справы з партыйнай вучобай? — запытвае член камісіі тав. Зэйфман, у правяраючага кандыдата КП(б)Б з 1930 году Барысэвіча. — Ці ведаеш ты, чаго дабіваўся Троцкі?

Тав. Барысэвіч ня ведае, чаго дабіваўся Троцкі. Такіх палітычна неграмотных кандыдатаў і членаў у машына-кацельнай ячэйцы шмат.

Камісія па чыстцы сустракаецца на ват з такім экспалатам.

— Мой бацька... быў кулаком. Раскулачан у 1931 годзе. Я з гэтага часу ня маю з ім ніякай сувязі... — прызнаецца член КП(б)Б з 1928 году, былы рэдактар пматтыражкі на электрастанцыі Кубрынскі. А пры паступленьні ў партыю ён гэта утаіў. Пры чыстцы ў 1928 годзе — таксама. На рабоце Кубрынскі праявіў сябе, як клясавы вораг. У часе затаснак ён адмаўляў барацьбу супроць кулацкага саботажу; бушуючы рэдактарам пматтыражкі, не праводзіў ніякай работы з рабочымі аб разгорнутай крытыкі і самакрытыкі на электрастанцыі.

А бюро партыйнага калектыву... чала ла чыстці.

В. СТАЛЬНОЎ.

Аб зьменах у складзе ячэйковых камісій па чыстцы менскай партарганізацыі

Пастанова Менскай гарадзкой камісіі па чыстцы КП(б)Б

Унесьці наступныя зьмены ў склад ячэйковых камісій: па партарганізацыі мэталёвай прамысловасьці замест тав. РАГУОКАГА членам камісіі назначыць тав. КВАСКОВА Н. Ф., члена партыі з 1917 году, члена прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б (сталяр заводу імя Мясьнікова).

Па партарганізацыі харчовай прамысловасьці замест тав. ЛІЎШЬЦА членам назначыць тав. АДЛЕРШТЭЙНА, члена партыі з 1917 году, пам. пракурора Вярхоўнага суда БССР.

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

Ад Рэспубліканскай Камісіі па чыстцы КП(б)Б

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б ЗНАХОДЗІЦЦА У ПАМЯШКАНЫІ ЦКК КП(б)Б — НК РСІ БССР; МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 55, ТЭЛЕФОН САКРАТАРЫЯТУ КАМІСІІ 22-678.

УСЕ МАТАР'ЯЛЫ І ЗАЯВЫ ПА ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ ПРОСЬБА НАКІРОВАЦЬ ПА ЎКАЗАНАМУ АДРАСУ НА ІМЯ САКРАТАРЫЯТУ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

Разгорнем усесаюзнае спаборніцтва на пяршынства па ўборцы і пастаўцы збожжа дзяржаве

Учора мы апублікавалі пастанову зьлёту брыгадзіраў перадавых калгасаў Днепрапятроўскай вобласьці. З яе зьместу відаць, што Днепрапятроўскі абком па-бальшавіцку ўзяўся за выпраўленьне дапушчанай ім грубой палітычнай памылкі ў пытаньні аб збожжазагатоўках.

Памылка Днепрапятроўскага абкому, як мы ўжо пісалі (гл. «Праўду» ад 3 чэрвеня), заключалася ў тым, што замест разгортваньня барацьбы за ПЕРШАЧАРГОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ КАЛГАСАМІ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ, ён самавольна паставіў задачу першачарговага — да выкананьня плану збожжазагатовак — снабжэньня калгаснікаў хлебам «удостаць, на 2-3 месяцы наперад».

Пасьля рашучага асуджэньня гэтай пазыцыі і лаводзін Днепрапятроўскага абкому з боку ЦК УсеКП(б) і тав. Сталіна абком прызнаў свае памылкі. АБКОМ ПАСТАВІЎ ПЕРАД САБОЙ ЗАДАЧУ, КАБ ДНЕПРАПЯТРОЎШЧЫНА Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ ПЕРШАЯ НА УКРАІНЕ ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПЛЯН ПАСТАЎКІ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ. Гэта рашэньне, як мы бачым з апублікаванага ўчора дакумэнту, поўнасьцю падтрымана прадстаўнікамі перадавых калгасаў вобласьці, якія ся свайго боку ад імя сваіх калгасаў АБАВЯЗАЛІСЯ ВЫКАНАЦЬ ГАДАВЫ ПЛЯН ПАСТАЎКІ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ НЕ ПАЗЬНЕЙ 15-20 ЖНІЎНЯ.

АБЯЦАНЬНЕ, ДАНАЕ ДНЕПРАПЯТРОЎСКІМ АБКОМАМ, ПАВІННА БЫЦЬ ВЫКАНАНА. «Слова бальшавіка — сур'ёзнае слова. Бальшавікі прывыкілі выконваць абяцаньні, якія яны даюць» (Сталін).

Абавязацельства Днепрапятроўскай партыйнай арганізацыі і перадавых калгасаў вобласьці дае новы штурмок у спаборніцтве рэспублік, краёў і абласьцей у барацьбе за ўмацаваньне калгасаў. ПЕРШЫ ТУР спаборніцтва-барацьбы за першае правядзеньне сяўбы — падыходзіць да свайго завяршэньня.

У гэтым першым туры ТАТАРЫЯ ВЫЙГРАЛА ЎСЕСАЮЗНАЕ ПЯРШЫНСТВА. Сярэдняя Волга атрымала верх над ЦЧВ, Маскоўская вобласьць узяла пяршынства ў спаборніцтве з Горкаўскім краем, Крым выйграў у Днепрапятроўскай вобласьці, Кабардына-Балкарыя — у Чаркесіі, Заходняя Сібір блясьпрчна выходзіць пераможцам у спаборніцтве з Уралам, Беларусь ідзе наперадзе Заходняй вобласьці, якая спаборнічае з ёю. Сярод спаборнічаючых краёў і абласьцей невыстарчальна толькі вызначыліся вынікі суперніцтва паміж Паўночным Каўказам і Нізкняй Волгай. У абодвух гэтых краёх узровень выкананьня пляну сяўбы амаль аднолькавы.

Другі тур спаборніцтва адкрыла Татарская рэспубліка.

УСЕТАТАРСКІ ЗЬЕЗД КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ АБВЯСЬЦІЎ БАРАЦЬБУ ЗА ЎСЕСАЮЗНАЕ ПЯРШЫНСТВА Ў ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНАЎ ЗБОЖЖАЗДАЧЫ ДЗЯРЖАВЕ. Партыйная арганізацыя і ўрад Татарыі разам з калгаснікамі-ўдарнікамі рэспублікі абавязаліся першымі ў Саюзе выканаць гадавы плян пастаўкі збожжа дзяржаве.

Водгукам на гэта абавязацельства ўсетатарскага зьезду калгаснікаў-ударнікаў зьяўляецца цэлер пастанова зьлёту брыгадзіраў Днепрапятроўшчыны, які заклікаў калгасы вобласьці да барацьбы за першынства ў збожжаздачы на Украіне.

Задача заключаецца ў тым, каб у гэтым другім туры спаборніцтва — на першынства ў збожжаздачы дзяржаве — ПАШЫРЫЦЬ ФРОНТ спаборніцтва, уцягнуць у яго ўсе, або амаль усе рэспублікі, краі, вобласьці, раёны, саўгасы, МТС і калгасы.

Адным з узорыкаў мабілізацыі, масмоска спужыць вытворчая нарада калгасаў, праведзеная палітаддзелам Вясёла-Куцкай МТС, Адэскай вобласьці.

У рэзультаце абмену думкамі калгасмана актыву былі ўстаноўлены маючыя ня-мапаважнае значэньне для посьпеху ўборачнай кампаніі папаўненьні.

Перш за ўсё выявілася, што патрэбна другая драполка збожжавых, або як гаварылі на нарадзе, «дажджы і цёплае надвор'е вельмі гоніць рост хлябоў, але буйна расьце і зельле». Перадавыя калгасы Вясёла-Куцкай МТС прапоную збожжавых уко пачалі. Значэньне гэтага пачыну вялікае таму, што ён не заістаўся ў нотрах толькі перадавых калгасаў, а дзякуючы вытворчай нарадзе стаў вядомым усім калгасам.

Другая важная акалічнасьць, ускрытая на нарадзе, датычыць папярэдняй кампаніі. Выявілася, што ў адстаных калгасах моцны такія настрої: «з пэ ром, бач, пасьпеецца. Нехай ранейшае папасуцца, потым траву скосім, а тады за папары возьмемся». Гэта даволі пашыраная ьявішча ня толькі ў раёне дзейнасьці Вясёла-Куцкай МТС і не толькі ў Адэскай вобласьці. Нямы дучненьні ў тым, што барацьба перадавых калгаснікаў супроць гэтых настроеў мае рашаючае значэньне для посьпехаў папаркай кампаніі.

Тут-жа высьветлілася, што ў некаторых калгасах абмяжоўваюцца толькі вырывам папару, не баранаючы яго, не вачышчаючы яго сыстаматычна ад пустазельля. Карысьці ад такіх папарэў мала больш таго, яны ператвараюцца ў расадзінкі пустазельля. Мабілізацыя ўдар і актыўнасьці перадавых калгаснікаў у барацьбе з гэтымі недахопамі, эноў та ўласьцівымі ня толькі калгасам раёна Вясёла-Куцкай МТС і ня толькі Адэскай вобласьці, мае вялізарнае значэньне для далейшага разьвіцьця масавага руху за высокую якасьць сацыямляроўства.

Пасьля канчатковага падліку наяўных рэсурсаў, пасьля ўпіну вопыту перадавых калгасаў і калгаснікаў у арганізацыі ўборкі, вытворчая нарада Вясёла-Куцкай МТС прышла да выводу, што ЎСЕ КАЛГАСНЫЯ ЗБОЖЖАВЫЯ ПАСЕВЫ Ў РАЁНЕ ДЗЕЙНАСЬЦІ МТС ПОЎНАСЬЦЮ МОЖНА ЎБРАЦЬ ЗА 1 ДЗЕН І ЗА 30 ДЗЕН ПОЎНАСЬЦЮ ЗАКОНЧЫЦЬ АБМАЛОТ.

Гэты падлік, праведзены разам з калгасным актывам, прадстаўляе сабой найлепшую канкрэтную аснову для разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва. І неабыпадкова, што тут-жа на нарадзе гэта спаборніцтва разгарнулася.

Сярод шматлікіх, заслугоўваючых бліскучай увагі прапаноў, з якімі выступалі калгаснікі-ўдарнікі на гэтай вытворчай нарадзе некаторыя асобна выдзяляюцца сваёй практычнасьцю.

— Не чакай, пакуль увесь вучастак усё поле пасьпее, а касі адразу-ж тады ўжо гатова, хоць-бы гэта быў адзін гэктар.

— Вяжы ў снапы ўвесь хлеб, адпры вязаньні не дапускай, каб чыста-гумуновае зерня потым засьмечвалася перарэсты рабіў з чыстай саломы, спачатку абтрыгшы з яе калаўсі.

— Капнуй адразу-ж, не пазьней, чым на другі дзень пачатку ўборкі.

— Сьцірпуй толькі тую частку, якую сваячасова ня зможаш перакінуць у малатарні. Загадзя намець гэту частку.

— Нагружай воз у момант, па-ваннему, а едзь павольна — па-гаспадарску.

— Перад уборкай дай коням добрае адпачыць.

— Авансы выдавай правільна: 10-15 проц. ад абмалочанага. Лодыру і прапушчыку — ніякіх авансаў.

— Уся брыгада ахоўвае калгасны ўраджай, як сваё вока. Ні аднаму злодзею не давай спуску.

— Хлеб падлік любіць. Ня вер вока: важ каля малатарні, важ і пры прыёмцы ў сьвірэн.

І як-бы ў дадатак да гэтых прапаноў калгаснікаў-ударнікаў рабіну Вясёла-Куцкай МТС прадстаўнікі перадавых калгасаў Днепрапятроўскай вобласьці са свайго боку, прапануюць рад іншых мерапрыемстваў:

— Влаі хлеб на элеватары і на прыстанцыйныя пункты з першага-ж абмалоту проста з-пад малатарань.

— Малаці ў першую чаргу кашчэйныя культуры і перш за ўсё пшаніцу. З яе і пачынай пастаўку збожжа дзяржаве.

— У ніжняй брыгадзе сьпучы зьмяні для бесперапыннай выязкі збожжа да поўнага выкананьня пляну збожжаздачы, не займай гэта зьвяно іншай і ботай.

— Падрыхтуй «бястарніх аблегчаны тыпу, зьбары і падладзь усе мяшкі, каб ня было ніякага затрыманьня ў збожжаздачы.

Вось канкрэтныя пёзунгі мабілізацыі ўсіх лепшых сіл калгасаў для пасьпяховага праведзеньня ўборкі і збожжаздачы, для разьвіцьця масавага спаборніцтва. Яны, відома, не ахапляюць усю бокаў работы, якія пачаліся і павінны пачацца.

Мы разьлічваем, што ў пачатым спаборніцтве на ўсесаюзнае пяршынства па ўборцы і збожжаздачы партыйныя арганізацыі і палітаддзелы прыкладуць усе сілы да таго, каб прынятае на сходзе абавязацельства выканаць з гонарам памятаючы, што «СЛОВА БАЛЬШАВІКА — СУР'ЁЗНАЕ СЛОВА».

(З перадавой «Правды»).

Бутокаў Е.

ВЫТРУЦІЦЬ „НЭПМАНСКІ ДУХ" І СПЭКУЛЯЦЫЙНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ З САВЕЦКАГА ГАНДЛЮ

Апошні рост таварных мас у краіне, задавальняючае попыту на рад тавараў, якіх раней не хапала, пытаньні ладным дабрыбыту рабочых і калгасных мас прадпаўняюць асабліва адказныя патрабаваньні да савецкага гандлю. Запатрабаваньні рабочых і калгаснікаў значна вырасьлі. Спажывец мае магчымасьць выбраць тавар і зусім натуральна ён імкнецца выбраць прадукцыю лепшую па якасьці і больш танную па цане. Ён сам правярае работу гандляючых арганізацый.

Вось чым характарызуецца цяперашні пярыяд савецкага гандлю.

Ці ўлічылі гандлюючыя арганізацыі гэтыя абставіны на рынку? Ці перабудавалі яны сваю работу? Ці навучыліся працаваць, па культурнаму на шырокага спажыўца? На гэта пытаньне трэба даць адмоўны адказ.

На паасобных вучастках савецкага гандлю наглядаюцца яшчэ недапушчальныя адносіны да спажыўца, ігнараваньне сугнасьці гандлёвай работы. Ня зжытыя яшчэ самыя шкодныя апартуністычныя погляды, быццам «рынак усё зьесьць». Задача паляпшэньня якасьці тавараў шырокага спажываньня не стаіць яшчэ ў цэнтры ўвагі дзяржаўных і кааперацыйных гандлёвых арганізацый. Гандлёвая сыстэма ня выконвае свайго элементарнага абавязку — быць максымальна шкільнымі ў адносінах да ўсякіх спроб навязаць брак, выкрываць гэтыя спробы, як антызьдзяржаўныя.

Можна прывесьці шмат прыкладаў, якія ілюструюць вышэйсказанае. «Зьвязда» паведамляла ўжо аб агідна дрэнная якасьці прадукцыі Віцебскай шкіпнай фабрыкі «Сьвітанак культурызацыі». На гэтым прадпрыемстве бесьперапынным сурмесем плыў брак. Дашчэ да таго, што Наркамлёгпрам СССР прымушан быў ужыць вышэйшую меру ўцэцэйнасьці—закрыць цэх. Што зрабілі гандлёвыя арганізацыі? Ці ўстанавілі яны заслон супроць браку? Ці прынялі яны рашучыя меры, каб не дапусьціць дрэнную прадукцыю да спажыўца? Не. Яны ў большасьці выпадкаў прымалі брак і гандлявалі ім, сьцягваючы прынцыпу: «спажывец усё возьме».

Яшчэ некалькі характэрных прыкладаў.

У купцу такою дзяржаўнай інспэкцыі пры пры НК РСІ стаіць шафа з экспанатамі браку. Шмат цікавага знойдзеце вы там.

У шафе знаходзяцца розныя рэчы, пачынаючы ад нежалёзнага цыркулю і школьнай ручкі і канчаючы дзіцячым калгуном. Усіх іх аб'ядняе адна якасьць — гэта яўны брак, на які злачынна выдатковаецца дзесяткі тысяч дзяржаўных сродкаў.

Вось пілы. Возьмем іх у рукі: пасьля лёгкага націску яны гнуцца. Зроблены яны з бляхі, каштуюць 2 руб. 23 кап. шт. Кому патрэбна такая прадукцыя? Косным, хто возьме яе ў рукі, скажа: нікуды ня варты тавар! Між тым іх закупілі нала 3.000 шт. Прадстаўнікі Саматсаб'ядкаўня і скіпкіна-мэталёвага аддзяленьня БКС Гесіна і Госмана набылі яўны брак.

Перад нашай вельмі цяжкі калун. Зроблен ён з чыгуну. Ударцо іх раз на палену, ён разьлецца на кавалкі. Каля 500 шт. такіх калуноў прыйшлі ны Гомельскай базе БКС з Цэнтрасаюзу. Яна спакойна аплаціла рахунак, не адмовілася ад навалкі ёй ніводнай прадукцыі.

Яшчэ экспанат. Зьвілістыя школьныя ручкі і цыркулі. Шмат пакут і клопатаў даўсь яны сушым. Паспрабуйце [illegible] ці пакінуць або [illegible] рацаваць цыркулем! Дарэмная праца! Між тым, некалькі сот такіх ручак і цыркуляў атрыманы Бактам з Адэсы на аснове заключанага дагавору.

Вось нарэ простага ялавага абутку. Яго яшчэ не насілі, а ўжо ў радзе месц ёсьць изюрыі. Зроблен ён з прагарелай скуры. Уплочана-ж за яго 30 руб. Прадстаўнік Гомельскага ТСТ спасылаўся за гэтым браком паехаў на Украіну, у Оумы, бліжэй, як пакаць, ён ня змог атабыць такой «высокякаснай» прадукцыі.

Арцель прамысловай кааперацыі яшчэ ня фінішыйся ў барацьбу за высокую якасьць. Даволі часта выпускаюць яны на рынак бракаваную прадукцыю, прычым кааперацыя і дзяржгандаль прадпаўняюць да гэтых зьяўлішчаў яўна прыміроцныя адносіны. За прыкладам ня трэба далёка хадзіць.

Гомельская арцель «Прагрэс» выпінула на рынак партыю столікаў. Дызэркі іх ня прычыняюцца, паліцы зроблены з крывай фальеры, крывыя—поўны брак.

Сьмілівецкая арцель зрабіла зусім ягодныя сталы. Гандлёвыя арганізацыі ўзялі гэту прадукцыю, але патрабавалі, каб прыехаў у Менск представнік арцелі для перагаворах аб якасьці тавару. Калі прыехаў прадстаўнік арцелі, дык аказалася, што стаялу нема. Зачачык мэблевай крамы Левін умудрыўся іх распрадаць, карыстаючыся тым, што ў той час на рынку не хапала столаў.

Як часці дагэтуль выпадкі прымусовага асартыменту, навязванньні ізвой сеткі непатрэбнай прадукцыі: «лопай, што даюць». Базам часта высылаюць тавары без усякага патрабаваньня з іх боку. Гомельская база БКС у красавіку адгрузила два вагоны [illegible] мелькай базе саўгасасьцкі прыслана партыя шчотак для мыцьця паголоўі на 25.000 руб. Нікчемны попыту на гэту прадукцыю ня было.

Усе гэтыя прыклады сьведчаць аб адным—аб злачынным ігнараваньні спажыў

ТОЛЬКІ АДЗІНЫ ФРОНТ МАСАВАЙ БАРАЦЬБЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПЕРАМОГУ ПРАЛЕТАРЫЯТУ

Пратэст эўрапэйскага антыфашысцкага кангрэсу супроць фашысцкага тэрору ў Германіі

ПАРЫЖ, 5 (Белта). Пасьля ўступнага слова РАКАМОНА кангрэсам быў прынят наступны парадак дня: 1) барацьба супроць фашызму і наступленьня капіталу, даклады аб рэвалюцыйным і антыфашысцкім руху Германіі, Польшчы і Італіі; 2) прыняцьце маніфэсту да працоўных Эўропы і рэвалюцыі супроць пагрозы новай імпэрыялістычнай вайны; 3) выбары Цэнтральнага камітэту эўрапэйскага антыфашысцкага аб'яднаньня.

Потым выступіў з дакладам аб германскім фашызмам МЮЛЕР. Кангрэс горача яго вітае. Мюлер заявіў, што германскія працоўныя будуць весьці ўсімі сродкамі барацьбу супроць фашызму, што будучае належыць пралетарыяту. Сацыял-дэмакраты, германскія лідэры падтрымліваюць фашыстаў таксама, як у 1914 годзе яны падтрымлівалі кайзэра.

«Другі інтэрнацыянал,—гаворыць Мюлер,—пад ударамі крызісу распаўся. Рэфармісцкія бюракраты падначаліліся фашызму. Рэвалюцыйная прафэпазыцыя пачала кіраваць антыфашысцкай барацьбой, арганізуючы рабочых у барацьбе за штодзенныя патрабаваньні на прадпрыемствах. Калі мы будзем мець веру ў дзеяньне, дык усе разам мы дасягнем перамогі».

Пасьля дакладу Мюлера, старшыня кангрэсу прапануе ад імя прэзыдыуму паслаць германскаму пасольству ў Парыжы тэлеграму пратэсту за подпісамі БАРБЮСА і інш. супроць сьмяротных прыгавораў, вынесеных рабочым у АЛЬТОНЕ і ХЭМНІЦЫ. Кангрэс адна галосна ўхваляе прапанову прэзыдыуму.

Потым БАРБЮС, спатканы сьпевам «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ», вітае кангрэс ад імя міжнароднага і францускага камітэтаў барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны: Антыфашысцкі рух па вінен весьці жорсткую барацьбу з фашызмам, яднаючы ў гэтай барацьбе масы працоўных і працоўнай інтэлігенцыі, служачых і дробнай буржуазіі, прычым нельга забываць вялізарную ролю моладзі. Гэта барацьба павінна весьціся пад лёзунгам—«Толькі адзіны фронт масавай барацьбы можа забясьпечыць перамогу пралетарыяту». (Аплёдысмэнты).

Пасьля Барбюса выступіў прадстаўнік антыфашысцкага руху ў ІТАЛІІ, якога кангрэс вітаў сьпевам Італьянскага рэвалюцыйнага гімну «БАНД'ЕРА РОСА». Ён заяўляе, што ў Італіі цяпер ўпяршыню ажыцьцёўлен вельмі шырокі адзіны фронт барацьбы супроць фашызму, у які ўключыліся, наперакор сацыял-дэмакратычнаму кіраўніцтву, шырокія масы сацыял-дэмакратычных рабочых. Прамоўца заяўляе, што пралетарыят павінен кіраваць антыфашысцкай барацьбой, пёгічнае завяршэньне якой—пабудова сацыялістычнага грамадзтва.

Пасьля Барбюс прачытаў тэлеграму, у якой гаворыцца, што югаслаўскі ўрад забаранёў ад'езд рабочых дэлегатаў-прадстаўнікоў нацыянал-рэвалюцыйнай ХАРВАЦКАЙ арганізацыі, а таксама дэлегатаў-прадстаўнікоў сельска-гаспадарчых рабочых СЛАВЕНІІ. Ад імя кангрэсу Барбюс пратэставаў супроць гэтых мер югаслаўскага ўраду.

Да арганізацый, прадстаўленых на кангрэсе, далучыліся такоэма ЛІГА БАРАЦЬБЫ ЗА МІР І МАКСЫМАЛІСЦКАЯ ПАРТЫЯ ІТАЛІІ.

ПОЛЬСКІ ДЭЛЕГАТ у сваёй прамове адзначыў пагоршаньне жыцьця працоўных у Польшчы. Пралетарыят адказвае на гэта забастоўкамі, якія маюць палітычны характар. Барацьба за зямлю,—гаворыць ён,—няўхільна ўзмацняецца. У адносінах да 16 тысяч палітычных зьняволеных ужываецца рэжым крымінальных злачынцаў. Нацыянальныя меншасьці прыгнечваюцца. Антыфашысцкі фронт мацнее, забастованны рух расьце, зьяўляюцца частымі вулічныя дэманстрацыі. Сацыялістычная партыя сее ілюзіі ў масах, прапаведуе шавінізм, нападае на СССР і процідзейнічае адзінаму фронту. Адна, рабочыя—члены сацыялістычных партый, часта далучаюцца да адзінага фронту.

Потым выступалі дэлегаты БАЛГАРЫІ, АНГЕЛЬСКАЙ НЕЗАЛЕЖНАЙ ПАРТЫІ, ГІШПАНІІ і камдэпутат бэльгійскага парляманту ЛЯІО.

Дэлегаты-сацыялісты ў колькасьці 200 чалавек, у тым ліку прадстаўнікі ІТАЛІІ, БЭЛЬГІІ, АНГЛІІ і шматлікія прадстаўнікі ГЕРМАНІІ і ФРАНЦЫІ нападзілі асобны сход, на якім абмеркавалі дэклярацыю аб адзіным фронце і выбралі выканаўчую камісію.

Ад'езд польскага пасланьніка п. Лукасевіча ў Варшаву

Заява пасланьніка карэспандэнту „Зьвязды"

6 чэрвеня, пасьля двухдзённага знаходжэньня ў Менску, пасланьнік Польскай рэспублікі ў СССР п. ЛУКАСЕВІЧ выехаў у Варшаву.

На вакзале пасланьніка праважалі пэрсанал генэральнага консульства Польскай рэспублікі ў Менску на чале з генэральным консулам п. ЯЛАВЕЦКІМ і ЧВА упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Замежных Спраў пры Ўрадзе БССР т. ГУСТЫР.

Перад ад'ездам польскі пасланьнік п. ЛУКАСЕВІЧ у гутарцы з карэспандэнтам «ЗЬВЯЗДЫ» перадаў наступную заяву.

— Ад'яжджаючы з Менску мне прыходзіцца шкадаваць, што я не магу застацца прынамсі яшчэ адзін дзень для таго, каб паглядзець Дзяржаўную бібліятэку імя Леніна і унівэрсытэт.

Адным з самых поўных уражаньняў, якое я атрымаў ад Менску, зьяўляецца ўражаньне аб інтэнсыўнасьці і мэтазгоднасьці работы, што праводзіцца ў такіх установах, як Беларуская Акадэмія Навук і садова-гародны Інстытут у Лошыцы.

У рабоце Беларускай Акадэміі Навук кідаецца ў вочы яе цесная сувязь з практычным жыцьцём, яе, так сказаць, непасрэдны, хаця і навуковы ўдзел у гаспадарчым будаўніцтве Беларусі. Лошыца зрабіла на мяне ўражаньне добра і з вялікай любоўю ергінізаванай лябараторыі, дасягненьні якой, бясспрэчна, знойдуць карысное ўжываньне ў саўгасах і калгасах.

Мне застаецца яшчэ пры ласкавым вашым пасярэдніцтве шчыра падзякаваць дырэкцыю Беларускай Акадэміі Навук і Лошыцы за аказаны мне ветлівы прыём і за дэтальнае азнаямленьне з работамі гэтых важнейшых для жыцьця Беларусі ўстаноў.

У Менску я быў у апошні раз 15 год таму назад. Само сабой зразумела, што прагрэс у сэнсе разьвіцьця гораду вельмі вялікі. Разгортваючаяся на вачох будаўніцтва ператварае гэты калісьці правінцыяльны гарадок у вялікую і прыгожую сталіцу Беларусі.

Мне будзе вельмі цікава скарыстаць тое, што Менск ляжыць па дарозе ў Варшаву, і час ад часу зазіраць і заяжджаць сюды, каб асабіста бачыць бясспрэчныя далейшыя посьпехі ў разьвіцьці сталіцы Беларусі, а таксама взнаёміцца з тымі ўстановамі, якія я зараз не пасьпеў наведаць.

Адным з вынікаў майго візыту будзе, між іншым, стварэньне больш цеснай сувязі паміж Беларускай Акадэміяй Навук і польскімі адпаведнымі навуковымі ўстановамі спэцыяльна ў галіне ўзаемнага абмену цікавымі абодва бакі працамі і творамі.

Райвыканкомы, сельсаветы, камсамольскія, прафсаюзныя і дарожныя арганізацыі—уключайцеся ў конкурс!

Дабейцеся перамог у барацьбе з бездарожжам!

Умовы конкурсу на лепшае правядзеньне дарожна-будаўнічых работ сэзону 1933 году

Конкурс на лепшае правядзеньне дарожна-будаўнічага сэзону 1933 г. ставіць сваёй мэтай прыцягнуць увагу ўсёй савецкай грамадзкасьці да цытаньняў дарожнага будаўніцтва, разгарнуць рашучую барацьбу з бездарожжам, дабіцца поўнага і дэтэрміноваго выкананьня пляну дарожнага будаўніцтва гэтага году.

У конкурсе прымаюць удзел раёны, сельсаветы, саўгасы, калгасы, МТС, аўтадораўскія, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, раёны і цэнтральныя друк і шматтыражкі, школы, дарожныя спэцыялісты, ударнікі дарожнага будаўніцтва і інш.

УМОВЫ КОНКУРСУ:

Для атрыманьня прэміі павінны быць абавязкова выкананы наступныя ўмовы:

А. Дарожна-эксплёатацыйныя вучасткі і АДПР

а) Выкананьне на 100 проц. вытворчай праграмы;

б) Поўнае выкананьне фізычнага аб'ёму працудзелу насельніцтва;

в) Найбольш рацыянальнае і эфэктыўнае выкарыстаньне працудзелу насельніцтва, узорная падрыхтоўка і арганізацыя работ;

г) Узьняцьце вытворчасьці на 25 проц., зьніжэньне сабекошту на 18 проц. і паляпшэньне якасьці работ;

д) Найлепшы і найбольшы ахоп брыгад гаспадарчым разьлікам;

е) Лепшае культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых;

ж) Лепшая мабілізацыя рабочых і ІТР на выкананьне праграмы дарожнага будаўніцтва, лепшая работа вытворчых нарад, прапрацоўка вытворчых плянаў сярод рабочых і ІТР і своячасовае складаньне гэтых плянаў.

Б. РВК, сельсаветы і Райдараддзелы

а) Найбольшае перавыкананьне пляну работ як у якасным, так і ў колькасных адносінах;

б) Своячасовае і поўнае выкананьне плянаў нарыхтоўкі і вывазкі ўсіх будаўнічых матар'ялаў;

в) Лепшая падрыхтоўка працудзелу насельніцтва, своячасовая распрацоўка і спуск пляну выкарыстаньня працудзелу, лепшае яго абгаварэньне, большая колькасьць сустрэчных плянаў і эфэктыўнасьць;

г) Правільная расстаноўка сіл, лепшае тэхнічнае абслугоўваньне, найбольш рацыянальнае выкарыстаньне працудзелу і поўная мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў;

д) Лепшае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва і арганізацыя брыгаднага мэтаду работ;

е) Узорная арганізацыя работ па замацаваньні вынікаў будаўніцтва, арганізацыя аховы дарог і дарожных пабудоў;

ж) Узьняцьце прадукцыйнасьці працы на 25 проц. і зьніжэньне сабекошту на 18 проц.;

з) Абавязковае прымацаваньне ў парадку шэфства асобных вучасткаў дарог і мастоў да асобных калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў і правядзеньне ўсіх зьвязаных з гэтым мерапрыемстваў;

і) Разгортваньне работы аўтадораўскіх арганізацый у раёне і практычны іх удзел у дарожным будаўніцтве.

В. Райсаветы і калектывы Аўтадору

а) Найбольшая сетка незалежных аўтадораўскіх калектываў і ячэек у калгасах, саўгасах і МТС, лепшая якасьць іх работ;

б) Лепшы ўдзел у складаньні будфінпляну, давядзеньне яго да кожнага аўтадораўца і лепшая яго папулярызацыя;

в) Лепшая дапамога дарожным органам пры правядзеньні работ, арганізацыя сацспаборніцтва і ўдарніцтва і стварэньне аўтадораўскіх брыгад; арганізацыя суботнікаў дапамогі дарожнаму будаўніцтву;

г) Лепшая арганізацыя аховы дарог і дарожных пабудоў, шырокае ўжываньне шэфства аўтадораўскіх арганізацый над мастамі і асобнымі вучасткамі дарог; арганізацыя дрэванасаджэньняў на дарогах;

д) Найбольшае перавыкананьне пляну работ з працоўным удзелам насельніцтва і найлепшае выкарыстаньне працудзелу.

Г. Райкомы і ячэйкі камсамолу

а) Актыўны ўдзел у прапрацоўцы плянаў работ з працудзелам насельніцтва і сустрэчных пляны;

б) Своячасовая і шырока праведзеная растлумачальная работа на падрыхтоўцы да дарожна-будаўнічага сэзону і асобных работ;

в) Пабудова разам з аўтадораўскімі арганізацыямі прасьцейшых дарожных прылад;

г) Актыўны ўдзел камсамольскіх ячэек у правядзеньні работ, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, прыцягненьне да работ агітпрапагандысцкіх сіл, піянэратрадаў і школьнікаў, дапамога правільнай расстаноўцы гатых сіл і рацыянальнае іх выкарыстаньне;

д) Арганізацыя шэфства камсамольскіх ячэек, піянэратрадаў і школьнікаў над асобнымі вучасткамі дарог і дарожнымі пабудовамі.

Д. Рабочкомы, прафсаюзныя арганізацыі і Гаррайпрафсаветы:

а) Лепшая арганізацыя рабочых і служачых, членаў прафсаюзу, на дапамогу ў правядзеньні працудзелу насельніцтва і дарожных работ, мабілізацыя культурных сіл і правільная іх расстаноўка на вучастках правядзеньня работ;

б) Ахоп аўтадораўскімі арганізацыямі ўсіх прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў раёну.

У АДНОСІНАХ ДА САЮЗАЎ ЧЫГУНДАРШАСУ І ШОФЭРАЎ:

1. Узорная арганізацыя працы і зарплаты;
2. Найбольшы ахоп рабочых сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам;
3. Найбольшая арганізацыя гаразрахунковых брыгад і разгортваньне паміж імі сацспаборніцтва;
4. Актыўная дапамога ў выкарыстаньні працудзелу насельніцтва;
5. Лепшае культурнае абслугоўваньне рабочых і ІТР;
6. Арганізацыя насьценных газет і шматтыражак;
7. Арганізацыя аўтадораўскіх калектываў у месцах правядзеньня работ, у саўгасах, калгасах і МТС;
8. Арганізацыя гурткоў па падвышэньні кваліфікацыі рабочых і ІТР.

Е. Калгасы, саўгасы і МТС:

а) Найбольшае перавыкананьне пляну ўдзелу калгасу, саўгасу і МТС у дарожных работах;

б) Лепшая падрыхтоўка да будаўніцтва, своячасовае ўключэньне ў свае вытворчыя пляны плянаў удзелу ў дарожным будаўніцтве;

в) Лепшая дапамога аднаасобнаму сэктару ў правядзеньні дарожнага будаўніцтва ў парадку працоўнага ўдзелу; падрыхтоўка і забесьпячэньне работ інструментам і прасьцейшымі мехпрыладамі і выраб іх на месцы;

г) Лепшая арганізацыя выхаду на працу, брыгад на асобных вучастках работ; арганізацыя сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж імі;

д) Забесьпячэньне пастаяннага нагляду за аховай дарог і дарожных пабудоў, арганізацыя шэфства над асобнымі вучасткамі дарог і мастамі і прымацаваньне для гэтага адказных асобаў;

е) Арганізацыя дрэванасаджэньняў удоўж дарог.

Ж. Брыгады і ўдарнікі:

а) Узьняцьце прадукцыйнасьці працы ня менш чым на 25 проц. і зьніжэньне сабекошту ня менш як на 18 проц.

б) Лепшая якасьць выкананых работ;

в) Перавыкананьне пляну работ;

г) Актыўны ўдзел у вытворчых нарадах і грамадзкай працы (прафсаюзнай, кааперацыйнай, аўтадораўскай і г. д.);

д) Узьняцьце па грамадзкі буксір адстаючых;

е) Разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў самой брыгадзе і паміж брыгадамі;

ж) Актыўная работа па растлумачэньні закону ўраду аб працудзеле насельніцтва ў дарожных работах і канкрэтная дапамога ў яго правядзеньні.

З. Цэнтральны і раённы друк:

а) Найбольш поўнае асьвятленьне ходу дарожнага будаўніцтва;

б) Арганізацыя сацспаборніцтва на лепшае і дэтэрміновае выкананьне пляну дарожных работ паміж асобнымі раёнамі, сельсаветамі, саўгасамі, калгасамі і МТС; арганізацыйнае кіраўніцтва ходам спаборніцтва: высылка выязных брыгад, арганізацыя чырвоных і чорных дошак, арганізацыя абмену вопытам і інш.

в) Разгортваньне барацьбы за своячасовую загатоўку і вывазку дарожна-будаўнічых матар'ялаў;

г) Праверка рабкораўскімі рэйдамі работы дарожных і аўтадораўскіх арганізацый і прыняцьце мер да выпраўленьня недахопаў у іх рабоце.

Па конкурсе ўстанаўляюцца наступныя прэміі на агульную суму ў 80.000 руб.

Грузавы аўтамабіль «ФОРД»		
— 1	—	7.000 руб.
Легкавы аўтамабіль «ФОРД»		
— 1	—	6.000 руб.
Абсталяваньне стацыянарнага кіно		
— 1	—	2.000 руб.
Кіно-порасовак		
— 2 па 1.000 р.		2.000 руб.
Абсталяваньне сельсаветаў і калгасаў		
— 4 па 600 р.		2.400 руб.
Радыёкропак		
— 5 па 500 р.		2.500 руб.
Абсталяваньне хат-чытальняў		
— 5 па 400 р.		2.000 руб.
Курортных месц з аплатай праезду туды і назад		
— 20 па 450 р.		9.000 руб.
Гарнітураў		
— 30 па 120 р.		3.600 руб.
Вэлёсыпедаў		
— 50 па 300 р.		15.000 руб.
Абсталяваньне клюбу (бібліятэка, струнны аркестр і інш.)		
— 1	—	2.500 руб.
Радыёпрыёмнікаў		
— 15 па 300 р.		4.500 руб.
Гадзіньнікаў		
— 50 па 120 р.		6.000 руб.
Бібліятэк		
— 30 па 150 р.		4.500 руб.
Прамтавараў		
— 100 па 50 р.		5.000 руб.
Грашовыя прэміі		
— 40 па 100 р.		4.000 руб.
Грашовыя прэміі		
— 10 па 200 р.		2.000 руб.
УСЯГО ПРЭМІЙ		
— 378 на агульную суму		80.000 руб.

ПАРАДАК ВЫДАЧЫ ПРЭМІЙ:

1. Для выдачы прэміі неабходна прадставіць у Галоўдартранс і камісію па конкурсе—канкрэтны матар'ял, які характарызуе ступень выкананьня арганізацыяй ці асобай, якая прадстаўляецца для прэміяваньня, паказальнікам конкурсу і пастановы па гэтым пытаньні Раённага Штабу па дарожным будаўніцтве;

2. Прэміі выдаюцца, не чакаючы сканчэньня дарожна-будаўнічага сэзону, адразу-ж па выкананьні той ці іншай арганізацыяй ці асобай вызначаных па конкурсе паказальнікаў.

3. Канчатковы тэрмін для прадстаўленьня на прэміяваньне па гэтым конкурсе ўстанаўляецца 15-га студзеня 1934 году.

Начальнік Галоўдартранса БССР ФРУМКІН.
Член прэзыдыуму ЦСПСБ АДАМ.
Нам. старшыні ЦС Аўтадору БССР АКІНЧЫЦ.

Беластоцкія тэкстыльшчыкі не здаюцца

Прадпрыемцы ідуць на ўступкі

3-га чэрвеня ў Беластоку раніцой інспэктар працы склікаў нараду прадстаўнікоў бастуючых тэкстыльшчыкаў і фабрыкантаў з мэтай давесьці да згоды заканчэньне доўгатрывалай забастоўкі. У часе перагавораў рабочыя заявілі, што не адступяць ад сваіх дамаганьняў. Тады інспэктар працы прапанаваў прадстаўнікам рабочых склікаць сход бастуючых і абгаварыць яшчэ раз свае ўмовы. А 4-й гадзіне адбыўся сход бастуючых, на якім дэлегаты рабочых зрабілі справаздачу аб перагаворах з фабрыкантамі. Сход аднагалосна парашыў адстойваць свае папярэднія дамаганьні.

А 9-й гадзіне ўвечары было прызначана новае пасяджэньне, на якім прадпрыемцы пашлі на значныя ўступкі. Яны прапанавалі выпрацаваць новыя расцэнкі зарплаты, якія-б былі кампрамісам паміж цэнькімам 1932 году, чаго дабіваюцца рабочыя, і цэнькімам 1933 году, які фабрыканты прабавалі ўвесьці і ад якога цяпер адмаўляюцца. **Прадстаўнікі бастуючых тэкстыльшчыкаў катэгарычна адмовіліся прыняць новыя ўмовы фабрыкантаў.** Тады інспэктар працы прапанаваў весьці перагаворы на падставе арбітражу. Рабочыя адкінулі гэту прапанову.

Інспэктар працы зьвярнуўся да прафсаюзаў тэкстыльшчыкаў і арганізацыі прамыслоўцаў з лістом, у якім адзначана, што забастоўка тэкстыльшчыкаў балюча б'е па інтарэсах прадпрыемцаў і ўносіць «дэкарамізацыю» грамадзянства. Буржуазная прэса, камэнтуючы ліст інспэктара працы, падкрэсьлівае, што ў працягваньні забастоўкі вінаваты прадпрыемцы і што рабочыя павінны мець лепшыя ўмовы быту. Гэты тон буржуазнай прэсы ярка сьведчыць аб **рашучасьці і стойкасьці бастуючых рабочых,** якія прымушаюць капіталістаў і іх урад ісьці на ўступкі.

На ўсіх мітынгах і сходах бастуючых панучае баявы настрой. Забастоўка ўсюды ідзе пад лёзунгам: **«Змагацца да перамогі».**

(Уласн. інфарм.).

ФРАНЦЫЯ ЗГАДЗІЛАСЯ ПАДПІСАЦЬ ПАКТ ЧАТЫРОХ

ПАРЫЖ, 7 (Белта) Сёньня Францускі савет міністраў заслухаў паведамленьне **Даляд'е і Поль Бонкура** аб перагаворах адносна «пакту 4-х» і пастанавіў упаўнаважыць Францускага пасла ў **Рыме** парафіраваць новы тэкст пакту.

Даляд'е заявіў, што тэкст пакту на выходзіць в рамкі статуту Лігі нацый і дае поўнае задавальненьне Францыі ў пытаньні аб узбраеньнях.

Амэрыканская пазыка Кітаю

ВАШЫНГТОН, 5. (БЕЛТА). З ухваленьня РУЗВЭЛЬТА «рэканструктыўная фінансавая карпарацыя» дала КАНКІНСКАМУ ўраду пазыку ў суме 50 мільёнаў даляраў. Пазыка дана ў форме крэдыту тэрмінам на 3 гады на закупку амэрыканскай бавоўны і амэрыканскай пшаніцы пад заклад падатковых даходаў з тытуню, мукі, бавоўнянага прадзіва, запалак, цэменту і г. д. Гэтыя падаткі далі кітайскаму ўраду ў 1932 г. звыш 20 мільёнаў амэрыканскіх даляраў.

Дэвіс хоча паладзіць Францыю з Германіяй

ЖЭНЭВА, 6. (БЕЛТА). 8-га чэрвеня адбудуцца перагаворы паміж **Норманам Дэвісам** і прадстаўнікамі Францыі па пытаньнях аб раззбраеньні. Ёсьць весткі, што Норман Дэвіс камеран зрабіць спробу арганізаваць новую канфэрэнцыю пяці дзяржаў у якім-небудзь нэйтральным месцы праз 10-14 дзён пасьля адкрыцьця сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі. Норман Дэвіс, **як** перадаюць, хацеў-бы, каб у гэтай канфэрэнцыі прымалі ўдзел як **Гітлер, так і Даляд'е.** Аднак, у Жэнэве лічаць, што на гэта ёсьць мала шансаў.

Наступленьне японскіх войск у раёне Нінхэ

ШАНХАЙ, 7. (БЕЛТА). Учора ў раёне **Нінхэ** (на паўночны захад ад Цянь цзіну) адбылася сутычка паміж кітайскімі войскамі і войскамі Манчжоу-го. Не жадаючы «ўскладняць становішча», кітайскія часьці адышлі і войскі Манчжоу-го заняли новы раён на поўдзень ад Нінхэ. Паведамляюць, што войскі Манчжоу-го ў шмат якіх раёнах дэмілітарызаванай зоны рабуюць насельніцтва. Пытаньне аб гэтых войсках, якія застаюцца ў дэмілітарызаванай зоне, наперакор згодзе ў Тангу, яшчэ ня вырашана.

Актыўныя дзеяньні кітайскіх партызан

МУКДЭН, 7. (БЕЛТА). Паводле слоў газэты **«Маньсюнпао»,** у раёне верхняга цячэньня р. **Ялу** з цэнтрамі **Лянцьзян** і **Чжанпай** наглядаецца ўзмацненьне актыўнасьці кітайскіх партызанскіх аддадаў. Мясцовая японская лесапрамысловая кампанія зьвярнулася за дапамогаю да штабу японскіх войск. Газэта **«Манчжурыя Дзілі-Н'юс»** паведамляе, што аддад антыманчжурскіх войск у колькасьці 800 чалавек атакаваў буйны горад **Тунфын** на захад ад **Тэліна.** Аддад падпалі і разбурыў шмат будынкаў, у тым ліку будынак японскага консульства. 5 японскіх рэзыдэнтаў зьніклі.

ВЕЧАР ШЭФСТВА БССР НАД БІРАБІДЖАНАМ

6 чэрвеня ў **Доме Камасьветы** адбыўся ўрачысты вечар, арганізаваны нацкамісіяй ЦВК БССР, Белкамзетам, Меназетам і ГОПС, прысьвечаны шэфству БССР над Біра-Біджанам і ад'езду групы адказных работнікаў на чале з нам. наркома РСІ тав. **Л. Гурэвічам на пастаянную работу ў Біра-Біджан.**

Вечар адкрыў сакратар ЦВК БССР тав. **Гініякевіч.** Ва ўступным слове тав. Гініякевіч адзначыў вялікую работу, праробленую за час шэфства БССР над Біра-Біджанам. Амаль усе цэнтральныя арганізацыі аказалі дапамогу Біра-Біджанскаму раёну работнікамі, спэцыялістамі, матар'ялам, літаратурай і г. д. Наркамзем паслаў на работу ў Біра-Біджан 15 апраномаў-спэцыялістаў, 10 мэліяратараў і інш. НКАховы Здароўя паслаў дакторо, мэдыкаменты, аказвае пісьмовую кансультацыйную дапамогу і г. д.

ЦК ЛКСМБ накіраваў на работу ў Біра-Біджан 20 камсамольцаў. Піянэрская арганізацыя адправіла спэцыяльны культвагон з кнігамі, спытамі, пісьмовымі прыладамі і рознымі іншымі культтаварамі.

Белдзяржкіно накіравала ў Біра-Біджан спэцыяльную кіно-экспэдыцыю. Ужо зазнаты важнейшыя аб'екты будаўніцтва — дасягненьні працоўных Біра-Біджану за апошнія гады.

Біра-Біджан, — кажа тав. Гініякевіч, — **гэта перамога нацыянальнай палітыкі партыі, гэта вялікі фактар інтэрнацыянальнай салідарнасьці пралетарыяту і працоўных Савецкага саюзу.**

У прэзыдыум урачыстага сходу пад гучныя воплескі выбіраюцца т. т. **Гікало, Галайдзе, Шаранговіч, Жаброўскі, Іваноў, Рыскін, Чарвякоў, Льчоў, Кудзелька, Герцовіч, Гершон, Гурэвіч, Крыпец,** усе ад'яжджаючыя ў Біра-Біджан таварышы і інш.

З прывітаньнем ад'яжджаючым ад рабочых заводу **Імя Варацьлава** выступіў тав. **Герман Бэйч** (на нямецкай мове). Тав. Бэйч адзначыў, што ў той час, калі ў Нямеччыне працоўнае яўрэйскае насельніцтва зьвярэкі тэрарызуецца і прыгнятаецца, у СССР — краіне дыктатуры пралетарыяту, яўрэйскае працоўнае насельніцтва разам з працоўнымі усіх нацыянальнасьцяй актыўна будуе сацыялістычнае грамадзтва, змагаецца за праграмішляк, за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі.

З прывітаньнямі выступілі т. т. **Ліўшыц** (абутковая фабрыка), **Пакумейка** (служба эксплёатацыі МБВ чыгункі), **Дубравіцкі** (Белкамзет), **Ляхаў** (сакратар ЦК ЛКСМБ), **Башмачнікаў** (Гарком КП(б)Б), **Бэр** (газэта «Акцябр»).

Ад'яжджаючых вітала таксама дэлегацыя менскай піянэрыі, якія рапартавалі аб падрыхтоўцы некалькіх куль турных вагонаў для пасылкі ў Біра-Біджан.

На прывітаньні адказвалі т. т. **Гурэвіч і Крыпец.**

Бурнымі воплескамі сход сустрэў зачытаную прывітальную тэлеграму ад'яжджаючым старшыні ЦВК БССР тав. **Чарвякова.**

Гастролі маскоўскага тэатру Ленсавету ў Менску

Сёньня, 8 чэрвеня, у будынку Беларускага Яўрэйскага Дзяржаўнага тэатру, у Доме Культуры пачынаецца гастролі Маскоўскага тэатру Ленінградзкага савету.

Прыезд у Менск гэтага тэатру зьяўляецца бясспрэчна важным фактам у тэатральным жыцьці сталіцы Беларусі.

Тэатр, які прадстаўляе сабой арганізм высокай тэатральнай культуры, вялікай ідэйнай насычанасьці, палітычнай завостранасьці, сапраўднага акторскага майстэрства, заўсім заслужана карыстаецца вялізарнай папулярнасьцю сярод рабочых гледачоў Масквы.

У сваіх пастаноўках тэатр пакажа рад буйных дасягненьняў тэатральнай культуры брацкай РСФСР.

Асноўная п'еса рэпэртуару тэатру «Разгром». П'еса, як вядома, інсцэнізавана Крашэньнікавым па аднайменным рамане Фадзеева «Разгром».

Другая п'еса «Миллион терзаний» Валянтына Катаева мае цікавасьць, як узор савецкага водэвілю-фарсу.

Трэцяя п'еса вядомага францускага пісьменьніка Бальзака «Уловки Кинопля» або, як цяпер тэатр яе назваў, «Гавань бурь», пастаўлена першы раз у Парыжы ў 1843 годзе.

Заслугоўвае вялікай увагі пастаноўка п'есы **Гогаля «Ревизор»** ня толькі таму, што яна зьяўляецца ўзорам клясычнага твору, але і таму, што галоўны вобраз п'есы **«Ревизор»** трактуецца артыстам маладым акторам Плотнікавым.

Неабходна прыцягнуць у тэатр арганізаванага гледача.

Гастролі БДТ III

6-га чэрвеня, у Менску пачаліся гастролі БДТ-3 пад кіраўніцтвам народнага артыста рэспублікі тав. **Галубка.**

З моманту рэарганізацыі тэатру в вандроўнага ў стацыянарны ён зрабіў гастрольнае турне па раду гарадоў і раёнаў БССР. Тэатр абслужыў Віцебск, Гомель, Бабруйск, Мозыр, Слуцак, Рэчыцу, Клімавічы, Горкі, Клінцы (РСФСР) і г. д.

У рэпэртуары тэатру рад новых пастановак—«Мой друг» Пагодзіна, «Дзяўчаты нашай краіны»—Мікіценка, «Суд» Кіршона, «Энтузіясты—Серабракова-Тарвіда, «Контр-атака»—Курдзіна.

П'есы афармляюць мастацкі кіраўнік т. Саньнікаў і заслужаны артыст рэспублікі тав. Міровіч.

Папраўка

У пастанове ЦВК і СНК БССР «Аб сельска-гаспадарчым падатку на 1933 год», зьмешчанай у «Зьвязьдзе» за 5 чэрвеня (№ 122), у 3 пункце 4 радку не патрэбна слова «сярэдніх»; у 10 пункце 13 радок патрэбна чытаць так: «аднаасобнік, які выбіраецца».

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

9-га чэрвеня г. г. а 7-й гадз. увечары ў Доме Камасьветы (клюб Карла Маркса) адбудзецца працяг лекцыі тав. Агульніка для партактыву на тэму: «Арганізацыйныя прынцыпы бальшавізму».

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 1 г. дня. Гукавы мастацкі прыгодніцкі фільм ЖЫЦЬ
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. 3-я сэрыя 3-я амэрыканскага прыгодніцкага фільму ШПАРКІ
ПРАЛЕТАРЫ Новы замежны фільм ПРЫСВОЕНАЯ БАЦЬКАМІ драма ў 7 частках
КІНО „СПАРТАК" Каса—з 3 г. 30 м. дня. З 7 чэрвеня замежны фільм ДЗЯЎЧАТЫ ТАК СА МА памыляюцца камэдыя ў 6 част. Штодзенна 5 сэансаў.

АДНАЎЛЯЕЦЦА ПРЫЁМ ПАДПІСКІ з 1-VII-г. г. на двухтыднёвую папулярна-тэхнічную часопісь па аўта-трактарнай і дарожнай справе
ОРГАН ЦС АЎТАДОРУ „ЗА РУЛЕМ"
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: год—7 руб. 20 кап., 6 мес.—3 руб. 60 кап., 3 мес.—1 руб. 80 кап.
Не папулярна-тэхнічную сэрыю кніг, прысьвечаных пытаньням аўтатрактарнай і дарожнай справы, 24 выпускі ў год.
„БИБЛИОТЕКА за РУЛЕМ"
2 разы ў месяц.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: год—9 руб., 6 мес.—4 руб. 50 кап., 3 мес.—2 руб. 25 кап.
На бюлетэнь ЦС Аўтадору, прысьвечаны рабоце таварыства па салзейнасьці разьвіцьцю аўтатрактарнай і дарожнай справы ў СССР.
„АВТОДОР"
24 нумары ў год.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: год—3 руб. 60 кап., 6 мес.—1 руб. 80 кап., 3 мес.— 90 кап.
На масавую-грамадзка-палітычную і навукова-папулярную штомесячную часопісь радыёаматарства.
„РАДИОФРОНТ"
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: год—14 руб. 40 кап., 6 мес.—7 руб. 20 кап., 3 мес.—3 руб. 60 кап.
Падпіска прымаецца поштай. Тыражы выданьняў абмежаваны. Сьпяшайцеся аднавіць падпіску.
ЖУРНАЛЬНА-ГАЗЭТНАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ.

Сёньня, 8-VI—г. г. у 5 гадз. на заводзе імя ВАРАШЫЛАВА адбудзецца
ПАСЯДЖЭНЬНЕ ЯЎРЭЙСКАГА НАРОДНАГА СУДА
па абвінавачваньні работнікаў МЕНГАРБЮРО САЮЗДРУКУ ў дрэнным абслугоўваньні рабочых-чытачоў газэтамі і часопісямі.
Запрашаюцца чытачы прадпрыемстваў і ўстаноў.
ЦЭНТРАЛЬНАЕ БЮРО КАНТРОЛЮ.

МЕНСКІ ГІДРАТЭХНІКУМ
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР
студэнтаў на мэліярацыйнае аддзяленьне і аддзяленьне водазабясьпячэньня—з ведамі на базе сямігодкі.
Прыём заяў з 5-га чэрвеня па 1-е жніўня 1933 г.
Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй паводле пасьпяховасьці.
Да заяў далучаюцца наступныя дакументы: засьведчаная анкета, давядка аб нараджэньні, аб адукацыі, аб сацыяльным і матар'яльным становішчы пастулаючага і яго бацьк